Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 11 1933 г.
№ 55 (4599)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся.

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ПРАЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ!

У «Правде» ня раз друкаваліся матар'ялы, якія сьведчаць аб актывізацыі разгромленых і выбітых з эканамічнай калініны мясцовых буржуазна-кулацкіх нацыяналістыцкіх рэшткаў і аб грубейшых скажэньнях ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Заслугоўвае асаблівай увагі ліст ЦК КП(б)Б і СНК БССР («Правда» ад 4 сакавіка) «Аб памылках партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі ў нацыянальным пытаньні». У гэтым лісьце яны прызнаюць, што многія кіруючыя партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі «не вядуць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў патураюць буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям». І гэта яны гледзячы на неадназовыя ўказаньні і перасьцярогі з боку ЦК УсеКП(б).

Савецкі саюз самая шматнацыянальная краіна ў сьвеце і разам з тым самая «дасканалая арганізацыя супрацоўніцтва народаў» (**Сталін**).

«Мы працоўнікі нацыянальнай акраіны, нацыянальнай роднасьці, нацыянальнай абасобленасьці.

Мы міжнародні... інтэрнацыяналісты...» Гэты лёзунг Леніна напісала на сваім сьцягу партыя. Кастрычніцкая рэвалюцыя пастаўіла крыж на калёнізатарскай, русыфікатарскай палітыцы царскага ўраду і высунула на сцэну раней забытыя народнасьці, прабудзіла іх да новага жыцьця, да новага разьвіцьця на сацыялістычнай аснове. Назнаёмцеся бліжэй з вынікамі першай пяцігодкі і вы зьдзівіцеся радыкальнай зьменай аблічча ўсіх народаў, аб'яднаных у Савецкі саюз. У нацыянальных рэспубліках і абласьцях краіны няўхільна мацнее савецкая дзяржаўнасьць. З кожным годам вырастаюць і ўтрымліваюцца сельская гаспадарка, ліквідуюцца фэадальна-байскія, кулацкія элемэнты, выкарчоўваюцца самыя тльбокія карэні ні эксплёатацыі. Павялічваецца сетка школ, газэт і тэатраў на мясцовых мовах. Растуць уласныя пралетарскія кадры, што яшчэ больш цэмэнтуе апору пралетарскай дыктатуры ў былых калёніях расійскай буржуазіі.

Дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы народы Савецкага саюзу — Татарыя, Башкірыя, Казакстан, Кіргізія, Дагестан і г. д. — здолелі перайсьці ад розных форм гаспадаркі і патрыярхальна-родавага быту непасрэдна да сацыялістычнага будаўніцтва, мінаючы капіталістычны шлях разьвіцьця.

Поўнасьцю забясьпечана магчымасьць свабоднага разьвіцьця і пасобным нацыянальным меншасьцям, якія падпадалі пры панаваньні капіталістаў і памешчыкаў нячуваным гнетаньням.

Які найвялікшы кантраст са становішчам шматмільённых мас працоўных Кітаю, Індыі, Марока, Альжыру, Конга і г. д., якія знаходзяцца пад цяжкім прэсам учіску з боку імпэрыялістычных дранежнікаў Эўропы, Амэрыкі і ўласнай буржуазіі.

Уступленьне СССР у другую пяцігодку сацыялістычнага будаўніцтва азначае яшчэ больш гаспадарчы і культурны ўздым і росквіт нацыянальных рэспублік і абласьцей нашай вялікай краіны.

Трэба, аднак, мець на ўвазе, што ў нацыянальным пытаньні выключна шкодна пакладацца на самацёк. Посьпехі далейшага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі будуць тым больш значнымі, калі кожная партыйная арганізацыя, кожны камуніст глыбока ўсьвядоміць тое новае, што ёсьць зараз у клясавай барацьбе ўнутры краіны, калі яны з яшчэ большай пасьлядоўнасьцю і непрымірымасьцю будуць змагацца за лінію партыі ў нацыянальным пытаньні супроць усіх і ўсякіх ад яе адхіленьняў. Узмацненьне магутнасьці Савецкага саюзу сустракае заўзятае супраціўленьне разьбітых контрэвалюцыйных, буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных груп, няўхільна ат рымліваючы свой асобтак і ўнутры партыі. Клясавы вораг і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва нацярпеўны рашаючае паражэньне ў адкрытых баёх, прабуе зараз іншымі спосабамі, іншымі сродкамі навязаць супроць нас свае апошнія сілы, распачалівую злосьць і нянавісьць. Ад мэтадаў непрыкрытай барацьбы ён перайшоў да мэтадаў барацьбы завуаляванай, не атрымліваючы ў радзе выпадкаў рашучага адпору з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Гэтым, перш за ўсё, і тлумачыцца тое, што за апошні час у радзе раёнаў, у прыватнасьці, Беларусі, Украіны, а таксама Сярэдняй Азіі і Казакстану, далёка не адзіныя выпадкі пранікненьня шавінізму на пасобныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва, у асобныя зьвенні савецкага і прафсаюзнага апарату, асабліва ў зямельныя органы і культурна-асьветныя ўстановы, а таксама ў школы, ВНУ і нават у рады партыі і камсамолу.

Гэтым у сваю чаргу тлумачыцца і тое, што ў радзе месц тых-жа рэспублік ажыліся ўхілісты ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму і мясцовага нацыяналізму.

Сутнасьць ухілу да вялікарускага шавінізму, як ня раз указваў т. Сталін, заключаецца перш за ўсё ў імкненьні абыйсьці нацыянальныя рознасьці мовы, культуры, быту, разьвіваць палітыку партыі па нацыяналізацыі апарату, прэсы, школы і іншых арганізацый і тым самым падарваць прынцып нацыянальнага роўнапраўя і падрыхтаваць ліквідацыю нацыянальных рэспублік і абласьцей. Іменна ў гэтым кірунку і арудуюць зараз вялікарускія шавіністы і іх агенты ўнутры партыі.

«Палітыка» вялікадзяржаўных ухілістаў зьяўляецца капітулянцкай перад трудналасьцямі нацыянальна-культурнага будаўніцтва і накіравана на, таксама як і «тэорыя» аб аслабленьні клясавай барацьбы, аб «плаўным» ходзе разьвіцьця і аб адміраньні пралетарскай дзяржавы, да падрыву савецкай улады. Вялікадзяржаўны ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай у нацыянальным пытаньні нашай партыі, бо ён у сваю чаргу стварае спрыяючую глебу для распальваньня нацыяналістычных пачуцьцяў сярод мас і тым самым узмацняе пазыцыі мясцовых буржуазна-кулацкіх і байскіх элемэнтаў і іх суўдзельнікаў унутры партыі. У выніку гэтага часамі ўхіл да мясцовага нацыяналізму набывае на пасобных вучастках і ў пасобных раёнах асаблівую надзённасьць. У гэтым мы ўпэўніваемся зараз на прыкладзе тэй-жа Беларусі, а таксама Украіны і ряду іншых нацыянальных рэспублік.

Як вядома — на гэта таксама ня раз указаў тав. Сталін — сутнасьць ухілу да мясцовага нацыяналізму заключаецца перш за ўсё ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, адыйсьці ад агульнага патоку сацыялістычнага будаўніцтва, ня бачыць таго, што зближае і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцей СССР і бачыць толькі тое, што можа іх адасобіць адну ад другой. Іменна ў гэтым кірунку і дзейнічае зараз ахвосьце разгромленых буржуазна-кулацкіх, нацдэмаўскіх і пятлюраўскіх банд і іх агенты ўнутры партыі, часта карыстаючыся клясавай сьлепатой мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Невыпадкова таму, што ў радзе раёнаў Беларусі, Украіны, Сярэдняй Азіі і Казакстану контр-рэвалюцыйныя нацыяналістычныя элемэнты і іх агенты прабавалі скарыстаць усе сродкі, у тым ліку школьныя катэдры, старонкі мясцовых часопісяў, падмосткі нацыянальных тэатраў для арганізацыі контр-рэвалюцыйнага сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Побач з гэтым яны пры простым папушчэньні некаторых мясцовых партыйных і савецкіх работнікаў імкнуцца процідзеяцтаўляць інтарэсы асобных рэспублік інтарэсам усёй краіны, усяляк ігнараваць нацыянальныя мовы і нават прасьледаваць за ўжываньне гэтых моваў. У Беларусі, напрыклад, адзнаго настаўніка Сьцяпура толькі за тое, што ён гугарыў з жонкай дома на расійскай мове, ухілісты да мясцовага нацыяналізму, падгараваны над дэмамі, апальмавалі і абвінавацілі ў вялікарускім шавінізме. Ці патрэбен яшчэ больш яркі прыклад безаконнасьці і грубейшага скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі?

Кожны сумленны камуніст, кожны сьвядомы рабочы і калгасьнік дасканала ведаюць, што наша партыя і савецкая ўлада аказваюць усялякае падтрыманьне будаўніцтву сацыялістычнай нацыянальнай культуры, ставячы ў галаву вугла палітыку «вближэньня пралетараў і поўпралетараў розных нацыянальнасьцей для супольнай рэвалюцыйнай барацьбы...» (З праграмы УсеКП(б). Усякі іншы пункт гледжаньня зьяўляецца выгодным толькі нашым клясавым ворагам.

Ня можа быць сумненьня ў тым, што ўхілісты да мясцовага нацыяналізму, прыкрываючыся фальшывым нацыянальным сьцягам, на сутнасьці справы абараняюць у сучасны пэрыяд клясавай барацьбы і ліквідацыі кулацтва, апошнія пазыцыі разгромленых, выбітых з эканамічнай калініны буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных элемэнтаў, граючы на руку міжнародным імпэрыялістам, на руку інтэрвэнтам. Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць усякага роду шавіністаў і ўхілістаў у нацыянальным пытаньні палічваецца, а ў радзе выпадкаў аказваецца магчымай, перш за ўсё, у выніку невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці, а часамі і грубых памылак мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Сапраўды, хіба не аб гэтым сьведчаць нядаўна апублікаваныя ў «Правде» матар'ялы аб вылазках і дзеяньнях антысавецкіх эсэраўскіх, нацдэмаўскіх і бундаўскіх элемэнтаў у некаторых раёнах Беларусі і ў Сярэдняй Азіі? Усе факты, вылажаныя ў гэтых матар'ялах, сьведчаць, што мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі не зразумелі новай тактыкі, новых мэтадаў рэшткаў разбітага кулацтва і аказаліся ў палоне ў мясцовых нацыяналістычных элемэнтаў і ўхілістаў да іх. І хіба, нарэшце, не аб гэтым-жа сьведчаць абураючыя факты грубейшага скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі на Украіне. І тут у радзе раёнаў у рэзультаце прыгушэньня клясавай пільнасьці, неразуменьня новых мэтадаў рэшткаў разбітых клясаў, недаацэнкі непарыўнай сувязі нацыянальнага пытаньня з сялянскім, атрымалася значнае аслабленьне барацьбы супроць ухілаў у нацыянальным пытаньні. У некаторых раёнах нацыянальная палітыка партыі праводзілася мэханічна, бяз уліку канкрэтных асаблівасьцей, без неабходнай выхаваўчай работы і неабходнага кантролю, без аддаваньня належнай увагі справе падрыхтоўкі бальшавіцкіх кадраў. Усё гэта бязумоўна грала на руку буржуазна - кулацкім, пятлюраўскім элемэнтам, палячаючы ім магчымасьць пралазіць у савецкі апарат, калгасы і г. д.

І тут дзе-ні-дзе была практыка пазбаўленьня нацыянальных меншасьцей права карыстацца роднай мовай. А з боку пасобных кіруючых украінскіх работнікаў узмоцнена прапагандавалася шавіністычная ідэя аб абавязковай украінізацыі пасобных раёнаў СССР.

Гэта, вядома, таксама не магло ня граць на руку кулацкім і пятлюраўскім элемэнтам, якія акапаліся ў нова-украінізаваных раёнах па-за мекамі УССР і вялі там разбуральную работу.

Клясавы вораг заўзята супраціўляецца пераможнаму будаўніцтву сацыялізму, накіроўваючы сваю зброю і супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Задачы партыйных арганізацый, асабліва Украіны, Беларусі, Сярэдняй Азіі, Казакстану і інш. нацыянальных рэспублік і абласьцей, а так сама мясцовага друку — заключаюцца ў тым, каб сваячасовым выкрыцьцём новай тактыкі і падкопаў клясавых ворагаў зрываць з іх маску і паказаць масам сапраўднае контр-рэвалюцыйнае аблічча буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных элемэнтаў, ухілістаў і прымірэнцаў да іх. Неабходна ўзмацніць практычнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, забясьпечыць выпрымаными кадрамі ўсе вучасткі нацыянальна-культурнага будаўніцтва, шырока разгарнуць інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Заваюем новыя вышыні нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу культуры народаў Савецкага саюзу.

Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму!

(Перадавая «Правды»).

Адкрыўся зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Меншчыны

Адрывісты званок. Узьлятае заслона. Кароткай уступнай прамовай адкрывае зьлёт сакратар гаркому КП(б)Б тав. ЧАРНУШЭВІЧ.

— 330 дэлегатаў—лепшых байцоў за ўмацаваньне калгаснага ладу, за бальшавіцкую сустрэчу веснавой сяўбы сабраліся сёньня для таго, каб падзяліцца пепшым вопытам, каб мабілізаваць усю масу калгасьнікаў Меншчыны на завяваньне парадавога месца ў барацьбе за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

— Калгасы і калгасьнікі Менскага раёну сустрэлі свой зьлёт як належыць будаўнікам сацыялістычнай вёскі. У гонар зьлёту прадана дзяржаве каля 30 тон збожжа.

Вітаючы дэлегатаў ад рабочых чырвонай сталіцы БССР і ад Менскай парт. арганізацыі, тав. Чарнушэвіч заклікаў удзельнікаў зьлёту да бальшавіцкай барацьбы за пераможнае правядзеньне першай вясны другой пяцігодкі.

Па прапанове дэлегата зьлёту тав. Шэўчанка зьлёт аднадушна выбірае прэзыдыум, у які ўвайшлі члены бюро ЦК і гаркому КП(б)Б, члены прэзыдыуму ЦКК і гарКК, ЦВК, СНК, гарсавету, бюро ЦК і ГК ЛКСМБ, прэзыдыуму ЦСПСБ і гарпрафсавету. Ад таварыства старых бальшавікоў выбіраецца тав. Сьмідовіч, прадстаўнікі рабочых мясцовых прадпрыемстваў, ад калгасьнікаў: КАСЬЦЯНЕЦКАЯ, ТРУШКЕВІЧ (удзельніцы Ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў), ГРЫП, ХМЯЛЕЎСКАЯ, МАКСІМОВІЧ, МАШЭК і САКОЛЬЧЫК.

Пад бурныя воплескі ўсёй залі выбіраецца ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА, КАГАНОВІЧА, ВАРАШЫЛАВА, КАЛІНІНА, АРДЖАНІКІДЗЭ, КУЙБЫШАВА, АНДРЭЕВА, ТЭЛЬМАНА, ЛЕНСКАГА, КОРЧЫКА і ГІКАЛО.

З дакладам аб задачах веснавой сяўбы і арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасах выступіў сакратар гаркому КП(б)Б тав. ЧАРНУШЭВІЧ.

Зьлёт вітаці прадстаўнікі Чырвонай арміі, рабочыя Менску і пімэры.

Сёньня ўвесь дзень будуць праходзіць спрэчкі па дакладу тав. Чарнушэвіча.

***

У фае дому Камасьветы арганізавана фота-вітрына пешых калгасьнікаў Менскага раёну. Тут-жа працуе кіёск Саюздруку, аддзяленьне пошты і даведачныя ашчадкасы.

ПРАЛЕТАРСКАЯ СУСТРЭЧА ЎДАРНІКАЎ КАЛГАСАЎ

Продажам тысяч пудоў збожжа адзначаюць калгасьнікі раённы зьлёт

На Койданаўскім тракце сёньня вялікае ажыўленьне. Тут за мастом, на перакрыжаваньні дарог спыніліся рабочыя дэлегацыі. Ад заводаў — імя Варашылава, «Бальшавік», па вырабе ланцугоў Галя, а таксама фабрык: абутковай, імя Крупскай і шпалерная — прыйшлі лепшыя ўдарнікі сустрэць дэлегатаў на раённы зьлёт калгасьнікаў ад сваіх пяці падшэфных сельсаветаў.

Дзесяткі аўтамашын чакаюць гасьцей, каб іх з саней перасадзіць на машыны. Дзесяткі сьцягаў, транспарантаў з прывітальнымі лёзунгамі, з цытатамі правадыра партыі т. **Сталіна.**

Ужо 12 гадзін, а дэлегатаў яшчэ няма. Лёгкі марозец пачынае дабірацца да ног.

— Маэстра, а ну вальс урэж, разагрэць ногі трэба! — І тут-жа на вуліцы пачаліся танцы.

— Едуць!

— Едуць!

На ўзгорку паказаліся першыя фурманкі. Аркестр абарваў вальс. Настроіліся ў калёны рабочыя шэфы.

Доўгай пасмай цягнецца абоз. Сотні вазоў!

— Чаму так многа? Дэлегатаў ад 5 сельсаветаў 93, а фурманак — сотні.

Як выявілася, калгасьнікі парашылі адзначыць раённы зьлёт масавым продажам збожжа дзяржаве.

На чале калёны вазоў ідзе **Сеніцкі** сельсавет — ён везе 300 пудоў збожжа. За ім **Грычанскі** — 270 пуд., **Самахвалавіцкі** — 200 пуд., **Крупіцкі** — 170 пуд., **Падгайскі** — 140 пудоў.

Фурманкі падыходзяць. На першай — сьцяг сельсавету, на другой — транспарант: **«Сустрэнем веснавую сяўбу па-бальшавіцку падрыхтаванымі!».**

Аркестр зайграў «Інтэрнацыянал». З калён рабочых шэфаў пасыпаліся прывітаньні:

— Няхай жывуць дэлегаты раённага зьлёту!

— Пралетарскае прывітаньне ўдарнікам сацыялістычных палёў!

— У-р-р-а!!!

Адказным прывітаньнем калгасьнікаў было:

— Няхай жывуць работы ўдарнікі чырвонай сталіцы БССР!

Спыніўся абоз. Цёплая братняя сустрэча. Раней за ўсё — аб справе.

— Ну, як в падрыхтоўкай да сяўбы? — першае пытаньне рабочага-варашылаўца да калгасьніка «Краіны Саветаў».

— Насеньне ссыпалі, сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантавалі, коні падсілкавалі. Пастараліся як належыць. Шэфу ня сорамна будзе.

— Так, і ў нас ня кепска. Прамфінплян трэці месяц перавыконваем, машын усё больш і больш выпушчаем — з гонарам заяўляе варашылавец.

Сярод дэлегатаў на зьлёт прыбылі калгасьнікі «Чырвонага спэцыяліста», які ўдарнай работай па падрыхтоўцы да сяўбы заваявалі сабе права на ўдзел у зьлёце. Зараз сярод шматлікіх дэлегатаў — 5 ад «Чырвонага спэцыяліста».

Пасьля абмену прывітаньнямі дэлегаты ўліліся ў калёны рабочых.

— На машынах паезьдзім пазьней, а зараз давайце разам прадэманструем па горадзе! — заявілі калгасьнікі.

Разам, рабочыя і калгасьнікі — ударнікі сацыялістычных заводаў і фабрык і ўдарнікі сацыялістычнай вёскі стройнымі радамі, плечо ў плечо рушылі па вуліцах Менску.

Вось дзе непераможная сіла!

Р. Д.

Чырвоныя абозы ў адзнаку зьлету ўдарнікаў - калгасьнікаў Меншчыны

У залі Гаосавету

ПЛЯЦ ВОЛІ. Першая гадзіна дня. Дом гарсавету ўпрыгожан лёзунгамі, сьцягамі, прывітаньнямі раённаму зьлёту ўдарнікаў сацыялістычных палёў. Адзін за адным пад'язджаюць аўтамабілі з дэлегатамі да будынку гарсавету.

Дэлегаты выходзяць з машын і падымаюцца па шырокіх усходах у залю гарсавету. Там уборны парадак, сьвятло і чыстата.

У залі расстаўлены столікі, накрытыя беласнежнымі абрусамі, тутжа вазоны з кветкамі, літаратура. Кожны столік для асобнага сельсавету. Дэлегаты падыходзяць да сталоў.

Вось у самым канцы залі, ля трыбуны, дэлегаты Папярнянскага сельсавету з адзінаццаці калгасаў: «Прагрэсу», «Адраджэнца», «Чырвонага ўдарніка», імя №-ай беларускай дывізіі і інш.

Вось дэлегаты ад калгасу «Перамога» — малады хлапец Герасімовіч Мікола, пажылы дзядзька Іваноўскі Алесь і дэлегатка Шмыр Марыля. Яны расказваюць пра свой калгас.

Плян веснавой сяўбы ў нас даведзен да брыгады і пасобнага калгасьніка. Брыгады арганізаваны на ўвесь час севазвароту. Коні разьбіты па брыгадах, зямля на вучастках. Насеньне ссыпана і ачышчана не... па пляну.

— Не па пляну? Што, не хапае?

Хлопец усьміхаецца.

— Ага! Па пляну ня ссыпана. Ячменю нам трэба было ссыпаць 35,2 цэнтн., а ссыпана 40,2 цэнтн., ліпаніцы трэба было 14,2 цэнтн., а ссыпана 21,3 цэнтн., бульбы трэба было 704 цэнтн., а ссыпана 810 цэнтн. Тое-ж і з аўсом. Ёсьць у нас ліпкаў жыта 24,6 цэнтн., якое мы хочам памяняць на што-небудзь іншае. Па ўсіх вамаль што культурах ссыпане як з гакам.

— А як коні?

— Коні — сярэднія. Добрыя коні. Пастромкаў, дугаў, каромыслаў хапае. Інвэнтар адрамантаваны ўвесь.

— А як у вас? — зварачаецца ён да дэлегата ад калгасу імя № беларускай дывізіі тав. Дзядзюлі Алеся.

У гэтага рапарт у вішні. З рапарту відаць, што калгасьнікі і тут падрыхтаваліся да веснавой сяўбы, каб пазьней ураджайнасьць, каб заможнымі жыць.

— Насеньне ссыпана поўнасьцю, — адказвае тав. Дзядзюля. — Некаторым культур не хапае, дык загоне ёсьць другіх лішак. Абмяняем. Коні добрыя і ў нас. Гною вывезена 200 тон. Летась пасеяні 68 га жыта. Ураджай будзе добры. Яравых пасеем ячменю — 35 га, бульбы — усю на ліпаі — 35 га, аўса — 50 га, ліпаніцы — 12 га.

Дэлегаты чытаць далей. У іх словах чуецца гаспадарнасьць, чаканьне вясны, каб з новымі сіламі, з новым энтузіязмам распачаць сяўбу. У іх чытаць чуецца пафас свабоднай працы, сьветлай будучыні, новых перамог.

М. Цэлеш.

У ГОНАР ЗЬЛЁТУ

Цяруцыць рэдкі пушысты сьнежок. Лёзунгі на чырвоных палотнішчах, што прычэплены да вузаваў грузавых машын, заклікаюць: «Няхай жыве першы раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Меншчыны!», «Бальшавіцкае прывітаньне дэлегатам зьлёту!», «За ўздым ураджайнасьці!».

12 гадзін дня. З хвілёны на хвілёну рабочая дэлегацыя дрэваапрацоўчага заводу імя Молатава чакае цягніка з Радашковіч. 10 хвілін першай гадзіны. Прарэзьлівы сьвісток паравоза абвяшчае аб прыбыцьці цягніка.

Цягнік прыязджае 17 дэлегатаў з Ратамскага сельсавету. Рабочыя цёпла сустракаюць ударнікаў - калгасьнікаў свайго падшэфнага сельсавету.

А вось і гомельскі цягнік.

З пушчы пасажыраў вылучаецца арганізаваная група. Барадатыя дзядзькі, маладыя хлопцы, жанчыны і дзяўчаты. Гэта 22 дэлегаты—калгасьнікі Кайкаўскага сельсавету — дэлегаты на раённы зьлёт. Цёплая сустрэча са сваімі шэфамі рабочымі «Саюзтрансу». Таварыскі абмен думкамі, паміж калгасьнікамі і рабочымі жвавая гутарка завязваецца. Кайкаўцы паведамляюць, што э імі прыехаў на зьлёт адзін адзіасобнік. Старшыня калгасу імя Варашылава з радасьцю таворыць.

— У гонар зьлёту з нашага сельсавету 30 фурманак вязуць чырвоным абозам збожжа для продажу ў «Закупхлеб».

Бяз мітусьні, арганізавана садзяцца калгасьнікі на грузавую машыну. Калгасьніцам прывіліея. Ім даюць лёгкавую машыну.

Машыны накіроўваюцца на плян Волі. Прыпынак ля гарсавету.

Тут ужо падрыхтавана сустрэча дэлегатаў. У вялікай залі на сталох газэты, кансультацыя па ўсіх пытаньнях, якія цікавяць калгасьнікаў. Тут-жа цырульня.

З дэлегатаў Кайкаўскага сельсавету першым падыходзіць да стала тав. **Маліноўскі**, старшыня калгасу «**Чырвоны партызан**». Запаўняецца анкета. Тав. Маліноўскі атрымлівае мандат № 182, атрымлівае накіраваньне ў першую савецкую гасьцініцу, талёны на абед, сьнеданьне, вячэру, білет у лазьню і цырульню, спытак з алоўкам.

Ухмылка распаўзаецца па твары дэлегата. Гэта адказ на цёплую сустрэчу пралетарскага Менску.

Б. Х.

Фашысцкі тэрор у Германіі ўзмацняецца

Фашысцкія бандыты расстрэльваюць рэвалюцыйных рабочых

ЛЕНДАН, 9. Кельнскі карэспандэнт агэнцтва «Рэйтар» паведамляе, што ў **Дуізбургу** (Рурская вобласьць) **знойдзен застрэленым на вуліцы адзін з кіруючых камуністаў.** Бэрлінскі карэспандэнт «Манчэстэр гардыян» паведамляе, што ў **Сельбо** (Баварыя) **нацыянал-сацыялісцкімі штурмавікамі застрэлена на вуліцы камуністка.**

У **Бупарталё** (Цюрынгія) член рейхсбанэру пілікаў замаху з боку 3-х чалавек і быў забіт. У **Бохума** (Рур) на тоўп нацыянал-сацыялістаў уварваўся ў кватэру двух членаў рэйхсбанэру і зьбіў іх. Абодва ў цяжкім становішчы перанесены ў шпіталь. У **Кэселе** штурмавыя атрады захапілі памяшканьне прафсаюзаў і ўзынялі над ім нацыянал-сацыялісцкі сьцяг. У **Кэнігсбэргу** кінута бомба ў сынагогу. У **Бохуме** над сынагогай быў вывешан нацыянал-сацыялісцкі сьцяг, які быў потым зьнят.

***

БЭРЛІН, 9. Заняцьце дому ЦК германскай кампартыі (дому імя Карла Лібкнэхта) суправаждалася парадам нацыянал-сацыялістаў і новай групы «сталёвага шлему». На парадзе кіраўнік бэрлінскіх штурмавікоў граф **Гельдорф** заявіў, што «цяпер будзе пакончана з ранейшым гаспадарэньнем камуністаў у Прусіі. Я заяўляю— сказаў ён,— што **за кожнага забітага ў Бэрліне ці Брандэнбургу нацыянал-сацыялісцкага штурмавіка заплоцяць мыцьцём тры камуністы».**

Нацыянал-сацыялісты арганізоўваюць яўрэйскія пагромы

БЭРЛІН, 9. **«Фойсішэ Цэйтунг», «Бэрлінэр Тагеблат» і «Франкфуртар Цэйтунг»** паведамляюць, што за апошнія 2 дні ў некаторых гарадох Рэйнскай і Рурскай абласьцей нацыянал-сацыялісцкія штурмавікі прымусілі закрыць рад яўрэйскіх магазынаў.

У **Эсэне** нацыянал-сацыялісты не дапускалі пакупцоў у буйныя універмаґі Карштадта і Вульворта. У рэзультаце гэтых нацыянал--сацыялісцкіх выступленьняў, у **Эсэне і Ботропе** закрыты ўсе яўрэйскія магазыны. Па паведамленьні агэнцтва «Конці» у Бэрмене ўчора «невядомы» напаў на консула Пэру і так зьбіў яго, што консула прышлося накіраваць у больніцу. Паліцэйская камэндатура прызнае, што пабіўшы консула насіў значок нацыянал-сацыялісцкай партыі.

У сувязі з тым, што ў Бэрліне напады былі зроблены на яўрэяў, якія аказаліся чужаземнымі падданымі, сёньня ў газэтах апублікавана характэрная заява аддзелу друку нацыянал сацыялісцкай партыі. Заява прабуе «апраўдаць» нацыянал-сацыялістаў і звальвае ўсю віну на «ворагаў», паказваючы, у прыватнасьці, што вінаватымі аказаўся нібыта зьяўляюцца пе разпранутыя ў форму штурмавікоў «камуністычныя агенты, або правакатары», якія быццам ставяць сабе мэтай «нанесьці шкоду аўтарытэту нацыянал-сацыялісцкай партыі за границай».

Класэн і Дэ-Лёнжэвіль былі расстраляны фашысцкімі штурмавікамі

Выкрыцьцё аўстрыйскай „Ротэ Фанэ"

ВЕНА, 8. Як паведамляе орган аўстрыйскай кампартыі **«Ротэ Фанэ»**, забітыя германскія камуністы **Класэн і Дэ-Лёнжэвіль** былі арыштаваны разам з іншымі 400 рабочымі-камуністамі Абергаузэну і заключаны ў будынку гімназіі. «Наперакор афіцыйнай версіі аб забойстве пры спробе ўцёкчы, — піша «Ротэ Фанэ», — **Класэн і Дэ-Лёнжэвіль у сапраўднасьці былі выведзены 6 сакавіка а 6 гадзіне раніцы нацыянал - сацыялісцкімі штурмавікамі і членамі «сталёвага шлему» ў двор гімназіі і там расстраляны».**

***

БЭРЛІН, 9. Учора паліцыяй занят дом рэфармісцкіх прафсаюзаў. Зачыненыя дзьверы выломваліся сякерамі, ламаліся і пісьменыя сталы. Аб рэзультатах вобыску нічога невядома.

Прасьледваньні рабочых узмацняюцца

Новая дырэктыва Герынга

БЭРЛІН, 9. Міністар унутраных спраў Прусіі **Герынг** зноў даў паліцыі дырэктыву весьці самую рашучую барацьбу супроць «разбураючай дзейнасьці» камуністаў. У прыватнасьці, ён прапануе пакончыць са «слабай у гэтых адносінах актыўнасьцю, якая дзе-ні-дзе прыкмячаецца ў паліцэйскіх органах. У гэтым-жа цыркуляры **Герынг** абвяшчае па-за чарговыя водпускі, прэміовыя ўзнагароды і нечарговыя прасоўваньні па службе за «асабліва пасьпяховую дзейнасьць» у справе прасьледваньня камуністаў. У другім цыркуляры Герынг прапануе ўсім паліцэйскім органам пры прыняцьці новых служачых у паліцыю ў першую чаргу скарыстаць нацыянальныя арганізацыі.

Краявы сацыял-дэмакратычны камітэт просіць абароны ў Гіндэнбурга

БЭРЛІН, 9. Учора ў Дрэздэне ў памяшканьне рэдакцыі с.-д. «Фольхсцэйтунг» зьявіўся атрад нацыянал-сацыялісцкіх штурмавікоў. Яны ўварваліся ў бібліятэку, выцягнулі ўвесь інвэнтар і кніжныя шафы на плян, зваліі ўсё у кучу і падпалілі. Бібліятэка згарэла. Другі атрад штурмавікоў заняў 7-паверховы народны дом, у якім знаходзіліся рэфармісцкія прафсаюзы і с.-д. арганізацыі.

Шыльда народнага дому сарвана і заменена шыльдай «Дом штурмавікоў». Пазьней доступ у памяшканьне быў закрыт паліцыяй і на даху ўзьнят нацыянал - сацыялісцкі сьцяг. Краявы камітэт с.-д. арганізацыі Усходняй Саксоніі ў тэлеграме да Гіндэнбурга просіць дапамогі.

Гішпанскія рабочыя супроць фашысцкага тэрору ў Германіі

БЭРЛІН, 9. Газэты паведамляюць, што перад германскімі консульствамі ў **Барсэлёне і Сэвільлі** адбыліся камуністычныя дэманстрацыі пратэсту супроць прасьледваньня германскай рэвалюцыйнай рабочай клясы. **У Сэвільлі** дэманстранты, па паведамленьні газэт, разьбілі вокны германскага консульства і г. д. Германскі пасол у Мадрыдзе заявіў гішпанскаму ўраду пратэст супроць дэманстрацыі і супроць тэндэнцыйных інфармацый у гішпанскім друку, рэзультатам якога былі дэманстрацыі.

Пра вытворчую брыгаду

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 9 сакавіка 1933 г.

Асноўным і рашаючым зьвяном у справе павышэньня ўраджайнасьці, узмацненьня сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, палітычнага і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада.

Пастаянная вытворчая брыгада будзе вырашаць посьпехі веснавой сяўбы, ад яе работы будуть залежаць вынікі барацьбы за высокі ўраджай і даход калгасаў і калгасьнікаў, ператвораныя ў жыцьцё лёзунгу тав. Сталіна «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

ЦК і СНК адзначаюць, што партыйныя, савецкія і зямельныя арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня пастаяннай вытворчай брыгады, у выніку чаго мелась ва многіх калгасах БССР груба парушаліся дырэктывы партыі аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад.

ЦК і СНК пастанаўляюць:

1. Прапанаваць Наркамзему, райкомам і гаркомам, РВК і МТС замацаваць у калгасах на 1933 год тыя брыгады, якія захаваліся ў сваім складзе і выконвалі ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго мінулага году. Арганізаваць да 25 сакавіка 1933 году пастаянныя вытворчыя брыгады ў тых калгасах, у якіх яны ня былі арганізаваны ў мінулым годзе, або раскаліся пры пераходзе ад веснавой сяўбы да ўборкі.

2. Выдзеліць ва ўсіх калгасах пастаянным паляводчым брыгадам зямельныя вучасткі ў палёх севазвароту, замацаваўшы за кожнай брыгадай вытворчы вучастак на тэрмін севазвароту. Зямельныя вучасткі павінны вызначацца па магчымасьці ў суцэльным масыве, або ў невялікай колькасьці вучасткаў, якія знаходзяцца на блізкай адзін ад другога адлегласьці, уліваючы пры гэтым асаблівае ўвагу кожнага пасобнага калгасу (разьмяшчэньне зямельных угыткаў, месца сядзібных вучасткаў калгасьнікаў і г. д.).

3. У дробных калгасах, якія аб'ядноваюць менш 15 гаспадарак, пастаянных вытворчых брыгад у паляводстве не арганізоўваюць. У гэтых калгасах асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на правільную расстаноўку людзей і на замацаваньне лепшых калгасьнікаў за найбольш адказнымі работамі (работа на машынах, апрацоўка глебы, сяўба рукамі, догляд жывёлы і г. д.). Кіраўніцтва паляводствам у гэтых калгасах павінна ажыцьцяўляцца старшынёю калгасу.

4. Для забесьпячэньня большай маневранасьці пастаянных брыгад і апрацоўнага кіраўніцтва брыгадай з боку брыгадзіра, брыгады не павінны быць празьмерна прамодзінні. Уліваючы вольных лепшых калгасаў, ЦК і СНК лічаць мэтазгодным устанаўліваць пастаянны склад калгасьнікаў у брыгадзе ў сярэднім 30-40 чалавек.

Укамплектаваньне калгасьнікамі паляводчых брыгад павінна забясьпечыць максымальна роўнамерную напружанасьць працы ў брыгадзе і паміж брыгадамі на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага пэрыяду.

5. Разьмеркаваньне працаздольнага складу калгасьнікаў па брыгадах павінна праводзіцца так, каб у першую чаргу былі забясьпечаны лепшымі калгасьнікамі паляводчыя і жывёлагадоўчыя брыгады, асабліва для найбольш адказных работ (сяўба, уборка, малацьба, апрацоўка глебы, догляд і дзеньне кароў, догляд сьвіней).

6. Праўленьням калгасаў замацаваць за кожнай брыгадай рабочых коняй, неабходны інвэнтар і сродкі вытворчасьці на цэлы год, перадаўшы іх брыгадзірам па вопісу. Выдзеленыя брыгадзе машыны і рабочыя коні замацаваць унутры брыгады за пасобнымі калгасьнікамі, якія (кожны пасобку) нясуць поўную адказнасьць за захаванасьць замацаваных за імі машын і інвэнтару. Да кожнага каня павінна быць прымацавана збруя і, як правіла, на ім павінен працаваць на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага пэрыяду толькі той калгасьнік, да якога ён прымацован. Усякасьці адказнасьць за захаваньне, беражлівыя адносіны да каня і своячасовае яго кармленьне, а таксама за стан упражы, — на калгасьніка, да якога конь і упраж прымацаваны, і на канюха, які даглядае коняй.

7. Пастаянная брыгада нясе поўную адказнасьць за выкананьне ўсіх сельска-гаспадарчых работ і агратэхнічных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці на замацаваным за ёю вытворчым вучастку, пачынаючы з падрыхтоўкі глебы і да ўборкі, абмалоту, пераапрацоўкі, здачы дзяржаве прадукцыі і захаваньня ўраджаю.

8. Падкрэсьліваючы асаблівае значэньне правільнай расстаноўкі рабочай сілы ўнутры брыгады для своячасовага і пасьпяховага выкананьня ўсіх работ на вучастку брыгады, забараніць каму-б там ні было праз галаву брыгадзіра ўцягвацца ў апэрацыйную работу брыгады і перакідаць з аднэй брыгады ў другую конную сілу, машыны і калгасьнікаў бяз ведама брыгадзіра.

Для ўзмацненьня адказнасьці брыгады і зацікаўленасьці яе ў барацьбе за выкананьне даручаных ёй работ і за ўзорны ўраджайнасьці ўстанавіць, што пры атрыманьні брыгадай ураджаю вышэй сярэдняга па калгасу — брыгадзе робіцца налічэньне працадзён у межах да 20 процантаў усёй колькасьці выпрацаваных ёю працадзён, з адпачасовым зьніжэньнем у тых-жа размерах тым брыгадам, якія далі ўраджай ніжэй сярэдняга па калгасу.

9. Абавязаць усе РВК, райза, МТС, сельсаветы і парт'ячэйкі не пазьней 1 красавіка 1933 г. распрацаваць і даць усім брыгадам галавыя вытворчыя заданьні для правядзеньня ўсіх работ на працягу ўсяго году. У гэтых заданьнях павінен быць канкрэтна паказан аб'ём заданьня, тэрмін выкананьня работы, увесь комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў, заданьне па ўраджайнасьці з улікам асаблівасьцей кожнага паасобнага вучастку, а таксама колькасьць працадзён, якая будзе налічана брыгадзе за выкананьне ўсяго вытворчага заданьня, эвыш якой брыгадзір ня мае права налічваць працадні калгасьнікам.

10. У мэтах шчыльнай увязкі работы брыгады з трактарнымі атрадамі МТС, устанавіць такі парадак, пры якім план гадавых работ вытворчых вучасткаў МТС абавязкова даводзіцца да кожнай вытворчай калгаснай брыгады. У адпаведнасьці з аб'ёмам работ МТС, што выконваецца на вытворчым вучастку брыгады, устанаўляецца не гадовае заданьне.

11. Падкрэсьліваючы асаблівую ролю брыгадзіра, як арганізатара калгаснай вытворчасьці, ЦК і СНК прапануюць Наркамзему, усім РК і РВК замацаваць на рабоце апраўдаўшых сябе ў мінулым годзе брыгадзіраў. Вы соўваць на работу ў якасьці брыгадзіраў лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, клясава праверэных і здольных на справе арганізаваць масу калгасьнікаў на пасьпяховае выкананьне задач партыі па палітычным і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

12. Брыгадзір нясе поўную адказнасьць за работу ўсёй брыгады, расстаўляе калгасьнікаў на рабоце, прымае ад іх выкананую работу, налічвае працадні і запісвае іх у працоўныя кніжкі калгасьнікаў. Устанавіць такі парадак, што дронную па якасьці работу брыгадзір ня прымае і зусім не залічвае калгасьнікам за яе працадні.

13. Пастаянная брыгада павінна стаць цэнтрам палітычна-масавай і культурнай работы ў калгасе, таму ЦК і СНК прапануюць усім РК і РВК, сельпартячэйкам і сельсаветам разгарнуць работу брыгадных вытворчых нарад, арганізаваць выхад брыгадных штодзённых газэт, асабліва ў час веснавой сяўбы. Брыгадная газэта павінна весьці рашучую барацьбу з лодырамі, прагульшчыкамі і шкоднікамі і мабілізоўваць калгасьнікаў, на аснове разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на справу найбольш пасьпяховага і ўдарнага правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

Культпропу ЦК сумесна з Наркамземам выдаць да веснавой пасеўнай кампаніі макет брыгаднай штодзённай газэты.

14. ЦК і СНК прапануюць усім РК і РВК, парт'ячэйкам і сельсаветам забясьпечыць канкрэтнае кіраўніцтва і практычную дапамогу праўленьням калгасаў у арганізацыі брыгад, ачыстцы іх ад кулацкіх і клясава-варожых элемэнтаў.

15. Навукова-дасьледчаму Калгаснаму інстытуту і Дзяржаўнаму Выдавецтву Беларусі не пазьней 1 красавіка выдаць масавым тыражом папулярную брашуру аб арганізацыі працы ў пастаянных вытворчых брыгадах у калгасах.

Старшыня СНК БССР
ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ.

НАЦПАЛІТЫКА НА ВЫВАРАТ

(Ліст у „Зьвязду")

Я працую ў Гомельскім эксплёатацыйным раёне Заходніх чыгунак. Паступіў на працу пасьля адбыцьця стажу (скончыў КІНТ у 1926 г.). Хачу зьвярнуць увагу на такія факты.

У студзені 1933 г. была ўхвалена пастанова агульнага (закрытага) сходу членаў партыі аб роспуску бюро ячэйкі. Зьнят з працы з абвяшчэньнем суровай вымовы сакратар ячэйкі тав. Гарбацэвіч, абвешчана таксама суровая вымова старшыні МК тав. Юраўцу за супраціленьне беларусізацыі (па заметцы раённай чыгуначнай газэты «Па сацыялістычных рэйках»).

Ня гледзячы на тое, што старое кіраўніцтва ячэйкі дэзарыентавала масу сваімі дзеяньнямі па нацыянальным пытаньні, новае кіраўніцтва ніякай растлумачальнай работы не вяло (да гэтага часу нават ня выканана пастанова МК ад 17 сьнежня 1932 г. аб пастаноўцы дакладу на агульным сходзе калектыву). Яно адразу прыступіла да праверкі... і накладаньня спагнаньняў. Праверку ў мяне рабіў асабіста сам Юравец. Ніякіх заўваг, усё добра.

Раптам 8 лютага мяне выклікаюць на пасяджэньне МК. Аказваецца, па справе беларусізацыі. У сувязі з ад'ездам, папярэджваю старшыню і сакратара МК і прашу пытаньне наконт мя не адкласьці. Аднак МК пры маёй адсутнасьці абвясьціў мне вымову «за няўжываньне белмовы ў гутарцы, ня гледзячы на папярэджаньне нацкамісіі (у 1932 г.), рад выступленьняў з прамовамі на агульных сходах МК-11 на расійскай мове, пры магчымасьці ўжываць белмову (якую ён добра ведае)».

Падкрэсьліваю, ніякіх заўваг нацкамісіі, ніякіх выступленьняў за шэсьць год на агульных сходах на расійскай мове ня было. Абураны такімі адносінамі прафсаюзная арганізацыя 11 лютага падаю заяву і прашу перагледзець пытаньне на МК і заслухаць мае тлумачэньні. Тав. Юравец у гутарцы адмаўляе. На пасяджэньні МК т. Юравец уносіць прапанову — не разглядаць майго пытаньня (за — 4 галасы, супроць — 3). Такім чынам МК адмаўляе ў самай скромнай просьбе, груба парушыўшы мае правы, як члена саюзу.

Я паскардзіўся на гэта сакратару ячэйкі тав. Іванову, РПС тав. Галаду. Апошняму тав. Юравец сказаў: «Пастанову перагледзім, але невядома ў які бок». Сваю пагрозу Юравец выканаў. 3-га сакавіка МК выключыў мяне з членаў саюзу на 6 месяцаў (падрабязных матыўаў прысьвеці не магу, таму, што ня ведаю — не атрымаў да гэтага часу копіі пратаколу). Так разгаваў т. Юравец на мае скаргі: замест вымовы — выключэньне з саюзу. Ва ўсім раёне толькі адно такое спагнаньне чамусьці адносна амаль што адзінага яўрэя ў апараце. Так пад відам «нацыянальнай палітыкі» выжываюць яўрэяў з транспарту (у апараце раёну нас усяго 3 чалавекі).

Гэтымі днямі відавочка пад другім соусам, — на ст. Гомель зволены ўсе 4 яўрэі, якія там працавалі.

М. Камінэр.

АД РЭДАКЦЫІ:

Рэдакцыя чакае ад Гомельскага партыйнага камітэту хуткага расьсьледваньня гэтай справы.

У калгасе арудуюць шкоднікі

(Ліст калгасьнікаў)

З ліста безанчукоўскіх калгасьнікаў тав. Сталіну мы даведаліся, як добра яны паставілі сваю гаспадарку і як добра таму яны жывуць. Уступіўшы ў калгас, мы таксама і зараз хочам толькі добрага жыцьця для сябе, паставіць так сваю гаспадарку, каб яна давала карысьць ня толькі нам—беднаце, але і дзяржаве.

Мы ведаем таксама і тое, што тав. Сталін у сваёй прамове на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў сказаў, што «наша бліжэйшая задача — зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

Мы добра зразумелі гэтыя словы правадыра, зразумелі, што гэта можна зрабіць толькі тады, калі мы будзем паляпшаць апрацоўку зямлі, лепш скары стоўваць сельска-гаспадарчы інвэнтар, ачышчаць нашы калгасы ад шкоднікаў і наогул ад клясава-чужых людзей. І вось, калі мы добра прыглядзеліся да праўленьня нашага калгасу «Зьвязда», Дудчыцкага сельсавету, Мсьціслаўскага раёну, дык ясна пераканаліся, што яно праводзіць яўна кулацкую шкодніцкую палітыку.

Бульбы ў нашым калгасе зьмерзла больш як 300 пудоў, бручка пагніла. Ільну праўленьне не хацела сеяць, а дзяржаву ашукала тым, што далі сельсавету фіктыўную зводку аб пасеве ільну. Пасеянага-ж ільну не даглядалі і ён пагніў на корані. За няздачу ільну наш калгас занесен на чорную дошку, што павінна было-б прымусіць праўленьне ўзварушыцца і працаваць так, каб зьняць з сябе гэту ганебную пляму. Але наша праўленьне замест сумленнай работы займаецца п'янствам і расьцягваньнем апошняга, што ёсьць у калгасе.

Калгасьнікі не атрымалі на працадні ні бульбы, ні збожжа, а само праўленьне бярэ сабе хлеб, бульбу, бярэ кармы. І колькі бярэ — нікому невядома, бо тыя, што ў праўленьні, — самі кладаўшчыкі, самы фуражыры і самі гаспадары. Ды дзе там ім клапаціцца аб бедняках, калі яны заможнікі і родічы кулакоў Макарэвічавых, Сафонавых, Страбчанкавых, Астапенкавых і Вараб'ёвых, якіх выгналі з калгасу, а некаторых і выслалі.

Аб гэтых агідносьцях мы заяўлялі ў сельсавет, але апошні баіцца зачапіць гэту хаўру таму, што родны брат старшыні калгасу Віктасёва Сьцяпана — Віктасёў Лявон працуе ў РКК-РСІ, а ў члена праўленьня Цімашкова — родны брат судзьдзёю. Гэта з аднаго боку, а з другога — сельсавет ня прымае ніякіх мер ацтчэ і таму, што там таксама сядзяць заможнікі. Вось чаму шкоднікі — старшыня калгасу Віктасёў і яго кампанія — не пакараны.

Мы просім ЦКК-РСІ і газэту «Зьвязда» дапамагчы нам ачысьціцца ад шкоднікаў, пінаватых у разбазарваньні калгаснай маемасьці і простым шкодніцтве, прыцягнуць да адказнасьці і наладзіць наш калгас так, каб мы змаглі ажыцьцяўляць указаньні тав. Сталіна не на словах, а на справе.

6 подпісаў калгасьнікаў.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя чакае ад Мсьціслаўскага райкому КП(б)Б расьсьледваньня і прыняцьця неабходных мер і просіць аб выніках паведаміць.

Пра артыкул „Як „Віцебскі пралетары" зрывае маскі",

зьмешчаны ў „Зьвязьдзе" ад 6 сакавіка г. г.

Пастанова бюро Віцебскага гаркому і прэзыдыуму гарКК КП(б)Б ад 8 сакавіка

1. Абмеркаваўшы артыкул, зьмешчаны ў газэце «Зьвязда» ад 6 сакавіка г. г. пад назвай «Як «Віцебскі пралетары» зрывае маскі», бюро Віцебскага гаркому і прэзыдыум гарКК КП(б)Б лічаць артыкул зусім правільным, які ўзьнімае перад віцебскай партыйнай арганізацыяй усю суму пытаньняў, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьбой са скажэньнямі ў яе практычным правядзеньні.

2. «Зьвязда» правільна ўказвае, што «Віцебскі пралетары» на ёў сыстэматычнай бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, не выкрывае і рашуча не змагаўся з вялікадзяржаўнымі і нацыянал-дэмакратычнымі элемэнтамі.

«Зьвязда» правільна таксама ўказвае на грубейшую палітычную памылку «Віцебскага пралетара», зьмясьціўшага артыкул т. т. Рубінштэйна і Кагана пад назвай «Начаткова саграць маску», аўтары якога, па сутнасьці стаўшы на шлях забаронаў каристаньня расійскай мовай, канцэнтруючы ўвагу на рабоце толькі цэнтру і украінскай трупы, дэмабілізуюць партарганізацыю, адводзячы яе ўвагу ад бальшавіцкай барацьбы з наяўнымі ў раёне фактамі праўлення вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і актывізуючымі за апошні час сваю дзейнасьць недабітымі яшчэ рэшткамі контр-рэвалюцыйных, нацдэмакратычных элемэнтаў і шавіністаў іншых колераў.

Зьмяшчэньне паказанага артыкулу ня толькі не мабілізуе ўвагу на неабходнасьць умацаваньня пралетарскага інтэрнацыяналізму, а, наадварот, льле ваду на млын буржуазна-кулацкіх, нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў.

3. Гарком і гарКК з усёй катэгарычнасьцю прызнаюць, што Віцебская партыйная арганізацыя да апошняга часу не арганізавала бальшавіцкай барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК і ЦКК, даных у 1931 г. па абсьледваньні партарганізацыі, дзе сказана, што:

«на палітычных уроках змагаць ня КП(б)Б з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, ня выхоўвалася партарганізацыя і рабочая кляса;... недапушчальна дрэннае становішча ў правядзеньні беларусізацыі, нерашучая барацьба з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму; беларусізацыя, як неадлучная частка ленінскай нацыянальнай палітыкі, ня ўзнята на прынцыповую палітычную вышыню; гэта зьяўляецца самым глыбокім прарывам у рабоце Віцебскай партарганізацыі».

Гэтыя бальшавіцкія ўказаньні, якія поўнасьцю захоўваюць сваю сілу і зараз, а таксама практычныя мерапрыемствы студзеньскага пленуму ГК, прынятыя на аснове іх, ставілі перад Віцебскай партарганізацыяй:

Неабходнасьць самай упартай сапраўднай бальшавіцкай барацьбы ня толькі кожнай партыйнай і савецкай арганізацыі, але і кожнага камуніста і камсамольца ў пасобку з фактамі праяўленьня клясава-варожых вылазак, асабліва ў нацыянальна-культурным будаўніцтве і на ідэалёгічным фронце.

Аднак, і пасьля рашэньня студзеньскага пленуму ГК да гэтага часу няма неабходнага пералому ў практычным ажыцьцяўленьні нацпалітыкі.

4. ГК і ГКК КП(б)Б в усёй бальшавіцкай рашучасьцю падкрэсьліваюць, што сьцялы «Правды» і ўказаньні тав. Гікало і Галадзеда ў лісьце ў «Правду» аб тым, што «партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі не вядуць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў натуралізуюць буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям», поўнасьцю падзяўджаюцца фактычным становішчам ажыцьцяўленьня нацпалітыкі ва ўмовах Віцебшчыны, аб чым сьведчыць выяўлены за апошні час рад фактаў вылазак антысавецкіх контр-рэвалюцыйных элемэнтаў пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыянальнага сьцягу, а таксама рад грубейшых скрыўленьняў палітыкі партыі ў нацпытаньні і мэханістычнае фармальнае правядзеньне яе з боку раду арганізацый:

а) контр-рэвалюцыйны верш студэнта кіно-тэхнікуму Эўрамскага пад назвай «Эпоха», які зусім у адкрытай контр-рэвалюцыйнай форме шаль муе дасягненьні сацбудаўніцтва, культбудаўніцтва, узводзіць паклёп на Чырвоную армію і калгаснае будаўніцтва, якому ня быў дан своячасовы бальшавіцкі адпор з боку партарганізацыі кіно-тэхнікуму;

б) рэцыдыў нацдэмаўшчыны ў тэор часьці мастака Мініна (мастацкі тэхнікум);

в) вылазкі яўрэйскіх нацыяналістаў у шматтыражках лесазаводу 13 і акулярнай фабрыкі;

г) выключэньне з партыі т. Шумкова парткалектывам акулярнай фабрыкі за напісаньне дагавору на расійскай мове (гэта памылка была своячасова выпраўлена з боку гаркому і гарКК і ў сувязі з іншымі момантамі бюро парткалектыву распушчана і сакратар парткалектыву з работы зьнят);

д) партком фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» паставіў на від старшыні фізкому за тое, што ён дапусьціў выбары старшыні цэхкому небеларуса;

е) зьняцьце з работы Якубоўскага фракцыяй гаркому саюзу працмастацтва і бюро ячэйкі, абвінаваціўшы яго ў вялікадзяржаўным шавінізьме за затрыманьне рэалізацыі білетаў Аэзтлётарэі.

Прыведзеныя факты з усёй выразнасьцю сьведчаць аб прыступленьні клясавай пільнасьці з боку раду работнікаў і парткалектываў і гнілых лібэральных адносінах да контр-рэвалюцыйных вылазак пад прыкрыцьцём фальшыва - нацыянальнага сьцягу, аб неразуменьні асноў нацпалітыкі партыі і бальшавіцкай задачы інтэрнацыянальнага выхавальня мас, неабходнасьці ва ўсёй рабоце па правядзеньні нацпалітыкі ставіць у галаву вутла «палітыку зблізжэньня пралетараў і поўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б).

5. Паказанае становішча і несвоячасовае ўскрыцьцё і рэагаваньне на выпішрырведеныя факты магло быць толькі таму, што ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні і перасьцярогі з боку ЦК КП(б)Б, ГК, гарКК, гарсавет, ГОПС, ГК ЛКСМБ і іншыя арганізацыі не зрабілі для сябе сапраўды бальшавіцкіх вывадаў з урокаў нацдэмаўшчыны, прыпічэпаўшчыны, разьбітых, але яшчэ недабітых, і якія актывізуюцца за апошні час.

Глыбокі прарыў у практычным правядзеньні нацпалітыкі, а таксама сыстэматычнае адставаньне ў выкананьні раду важнейшых гаспадарча-палітычных заданьняў ЦК ёсьць вынік таго, што Віцебская партарганізацыя, савецкія, прафэсыянальныя і іншыя органы яшчэ па-бальшавіцку не перабудаваліся ў бок канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва і выразнага бальшавіцкага выкананьня дырэктыў, не разарвалі яшчэ сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, ня вытруцілі саноўна-панскіх мэтадаў кіраўніцтва і славесная дэкларацыйнасьці, не разарвалі яшчэ бальшавіцкай барацьбы з буржуазнымі перажыткамі і гнілалібэральнымі элемэнтамі, якія пралезьлі ў партарганізацыю і часта прыкрываюцца фальшыва - нацыянальным сьцягам.

ГК і гарКК прызнаюць, што да гэтага часу як у партарганізацыі, так і сярод рабочых і калгасных мас не пастаўлена на адпаведную вышыню сыстэматычная работа па прапагандзе асноў ленінскай нацпалітыкі і што практычная работа па ажыцьцяўленьні яе ня ўвязваецца з глыбокай масава-выхаваўчай работай.

1. За адсутнасьць пастаноўкі на старонках газэты сыстэматычнай прапаганды асноў ленінскай нацпалітыкі і практычнага яе правядзеньня, штодзённай барацьбы са скажэньнямі нацпалітыкі, за перэагаваньне на зьмешчаны палітычна-шкодны артыкул т. т. Рубінштэйна і Кагана пасьля азнаямленьня з ім, рэдактару газэты «Віцебскі пралетары» т. Разэнблюму абвясьціць вымову.

Намесьніку рэдактара газэты тав. Фалкіну за зьмяшчэньне паказанага артыкулу ў газэце і невыстарчальнасьць барацьбы за перабудову газэты па ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі абвясьціць вымову.

Канстатаваць, што т. т. Разэнблюм і Фалкін у даным канкрэтным выпадку зьмяшчэньнем палітычна-шкоднага артыкулу праявілі прыступленьне бальшавіцкай пільнасьці і настарожанасьці.

Абавязаць рэдакцыю «Віцебскага пралетара» даць разгорнутую крытыку дапушчаных памылак у нацпытаньні на старонках газэты і ў цэнтральным друку.

Прапанаваць рэдакцыі газэты сыстэматычна асьвятляць на старонках газэты пытаньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва, выкрываючы і адносячы бязьлітасны ўдар па антысавецкіх элемэнтах, якія часта выступаюць пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыянальнага сьцягу, а таксама асьвятляючы вялікі станоўчы вопыт культурнага будаўніцтва ў БССР і раёне.

2. Тав. Рубінштэйн і Каган — аўтары палітычна-шкоднага артыкулу, якій праявілі палітычную сьлепату і сказілі аснову ленінскай нацпалітыкі, сталі па сутнасьці на шлях апалёгіі клясавага ворага — заслугоўваюць выключэньня з партыі, але, прымаючы пад увагу, што т. т. Рубінштэйн і Каган у сваёй заяве, паданай у ГК, прызналі і асудзілі свае памылкі, далі катэгарычнае абяцаньне рашуча выправіць іх на практычнай рабоце, — абвясьціць тав. Рубінштэйну і Кагану суровую вымову і зьняць тав. Рубінштэйна з работы сакратара ячэйкі КП(б)Б кіно-тэатральных устаноў. Абавязаць т. т. Рубінштэйна і Кагана выступіць у друку з разгорнутай крытыкай сваіх памылак.

3. За адсутнасьць клясавай пільнасьці, праяўленьне палітычнай блізарукасьці і гніла-лібэральных адносін з боку дырэктара кіно-тэхнікуму тав. Шапавала, які, зводячы аб контр-рэвалюцыйнай вылазцы Жаромскага і інш., ня толькі не забясьпечыў своячасовага неабходнага рэагаваньня, а стаў на абарону іх, — з работы дырэктара тэхнікуму зьняць і ў сувязі з наяўнымі дадатковымі матар'ялам, якія характарызуюць невадальняючую работу тав. Шапавала ў тэхнікуме, справу аб яго партыйнасьці перадаць на разгляд парткалегіі ГКК.

4. Заслухаць на чарговым пасяджэньні бюро гаркому даклад аб становішчы і рабоце парт'ячэйкі кіно-тэхнікуму і фракцыі саюзу працасьветы.

Даручыць ГК ЛКСМБ неадкладна праверыць работу камсамольскай ячэйкі кіно-тэхнікуму, прыняць неабходныя меры да ўмацаваньня работы ячэйкі.

5. За дапушчаныя палітычныя памылкі ў правядзеньні нацпалітыкі з боку ячэйкі працмастацтва і гаркому саюзу абвясьціць суровую вымову бюро ячэйкі і фракцыі гаркому саюзу працмастацтва, абавязаўшы неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі.

6. Даручыць культпропу гаркому неадкладна праверыць ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» і, у прыватнасьці, пастаноўку інтэрнацыянальнага выхаваньня.

7. Гарком і ГКК адзначаюць, што ў пастанове пленуму ГК у разьдзеле дзесятым, дзе сказана: «пленум лічыць, што адсутнасьць масавай работы па арганізацыі рабочага гледача і палітычнай увагі БДТ-2 зьяўляецца вынікам вялікадзяржаўніцкіх адносін раду кіруючых работнікаў прадпрыемства да нацыянальнай культуры і абавязвае фракцыю РСПС павесьці самую рашучую барацьбу з такімі фактамі», — правільна ўказваецца на наяўнасьць фактаў простай недаацэнкі работы БДТ-2 у Віцебску, аднак, гэты разьдзел зьяўляецца палітычна - памылковым, цаколькі ня зроблена ўказаньня аб неабходнасьці разгортваньня масавай работы па арганізацыі гледача і рашучым недапушчэньні якога-б там ні было адміністраваньня. Таму ўнесьці папраўку гэтага пункту на зацьвярджэньне надыходзячага пленуму гаркому.

8. Лічыць неабходным склікаць па 20 сакавіка г. г. аб'яднаны пленум гаркому і ГКК КП(б)Б для абгаварэньня праверкі становішча практычнага ажыцьцяўленьня нацпалітыкі, выкананьня дырэктыў ЦК і ГК і задачах партарганізацыі.

Для падрыхтоўкі пытаньня да пленуму і правядзеньня праверкі выкананьня пастановы стварыць камісію ў складзе т. т. Зіноўева (старшыня), Разэнблюма, Квінта, Рубінчыка, Марока.

9. Прапанаваць культпропу правесьці праверку да пленуму ГК і ГКК пастаноўкі прапаганды асноў нацпалітыкі ў сетцы партасьветы, школах, тэхнікумах і ВНУ.

Абавязаць культпроп ГК ўнесьці не пазьней як праз дэкаду прапановы аб умацаваньні кіраўніцтва літаратурна-мастацкімі арганізацыямі раёну.

10. Прапанаваць культпропу ГК і прафсавету правесьці гарадзкі сход навуковых работнікаў і настаўнікаў для абгаварэньня пытаньняў ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі ў горадзе і раёне.

11. Гарком і ГКК КП(б)Б з усёй катэгарычнасьцю абавязваюць парткалектывы і ячэйкі, кожнага камуніста і камсамольца забясьпечыць на справе, а не славесна-дэкларацыйна, сапраўды бальшавіцкую барацьбу на два фронты, супроць усякіх ухілаў ад ленінскай нацпалітыкі, да канца выкрываючы і бязьлітасна зматаючыся з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з недабітымі яшчэ рэшткамі контр-рэвалюцыйнай беларускай нацдэмаўшчыны, якая зараз актывізуецца, з шавінізмамі іншых колераў. Бальшавіцкая годнасьць кожнага камуніста павінна вымярацца яго непахіснасьцю і бальшавіцкай настойлівасьцю ў барацьбе за тое, каб у корані спыніць кулацка - буржуазныя тэндэнцыі, у барацьбе за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму.

У аснову штодзённай работы парткалектываў, ячэек, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый павінны быць пакладзены ўказаньні «Праўды», «Зьвязды» і ліста т. т. Гікало і Галадзеда, якія навучаюць таму, як трэба не на словах, а на справе весьці барацьбу за сапраўды бальшавіцкае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі і да канца змагацца в ухіламі ад ленінскай лініі нашай партыі.

Сакратар гаркому КП(б)Б
МІЦЬКОЎ.

Старшыня ГарКК КП(б)Б
ВЭНЗЭЛЬ.

ЛЕСАЗАГАТОЎКІ

АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ У ЛЕСЕ

Калі на 1-га сакавіка квартальны плян загатовак будаўнічых матар'ялаў па Чэрвеньскім леспрамгасе выканан на 93,2 проц., дык заданьне па загатоўцы дроў — толькі на 40,5 проц. Тое-ж і з вывазкай. Будматар'ялаў вывезена 70,5 проц., дроў — 52,8 проц.

Самы адстаючы вучастак, які значна зьніжае агульны процант выкананьня пляну лесазагатовак, — Натальеўскі. На 1-га сакавіка ён выканаў свой плян па загатоўках будматар'ялу толькі на 49,8 проц., дроў — на 18,6 проц. Вывезена будматар'ялаў 55.9 проц. Такое становішча тым больш недапушчальна, што на тэрыторыі гэтага вучастку ёсьць лежнявая дарога. Лежнёўка выканала сваё квартальнае заданьне па вывазцы будматар'ялаў толькі на 19,6 проц. і дроў — на 10,7 проц. Такія «ударныя» тэмпы яна дае з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал. І дахто, ні кіраўніцтва Натальеўскага вучастку, ні кіраўніцтва леспрамгасу не пацікавілася прычынамі такой дрэнкай работы.

Ня лепш за лежнёўку працуе ўласны транспарт Чэрвеньскага вучлесгасу. Ён сыстэматычна ня выконвае сваёй дзённай нормы выпрацоўкі. Замест 90 кбм. уласным транспартам вывозіцца ў дзень толькі 40. Загадчык транспарту Канстантыновіч і вэтэхнік абозу Зайцаў злачынна адносяцца да коняскага паталоўя. Калечаньне коняй, барбарскі догляд іх — звычайная зьява. З 30 коняй, якія ёсьць у транспарце, выяжджае ў лес штодзённа толькі 18-20.

Яшчэ ў пачатку лютага пастановай раённай апэрацыйнай тройкі па лесазагатоўках за поўную бязьдзейнасьць і зрыў загатовак і лесавывазкі зьнят з работы і аддан пад суд старшыня Вайнілаўскага сельсавету Зяневіч. Гэта нічому не навучыла старшыню Дамавіцкага сельсавету Шумко. Усю зіму сяляне вёскі Дамавіцк, пад самым носам сельсавету, сабатавалі лесавывазку. Арганізаваў гэты сабатаж кулацкі агент Пенкрат. Колькі работнікі Натальеўскага вучастку не складалі актаў на Пенкрата і да яго падобных, Шумко хаваў гэтыя акты пад сукно, не перадаваў іх у суд для прыняцьця арганізатараў сабатажу на адказнасьці. Самыя злосныя сабатажнікі лесавывазкі вёскі Дамавіцк так гаворыць аб Шумко: «Ого, такіх-бы старшыню нам як мага больш! Ён, брат, нас у крыўду ня дасьць. У яго, як у бога за пазухай».

Зараз, у сувязі з падрыхтоўкай да нацвай заняліся мясцовыя парт'ячэйкі і сельсаветы, якія павялі шырокую растлумачальную работу пра значэньне лесавывазкі, выкрываючы прыцягваючыя ўвагу сяброў адказнасьці злосныя сабатажнікаў, і ў лесазагатоўках намецілся пералом.

Трэба сказаць, што ўсе лясныя вучасткі Чэрвеньскага леспрамгасу маюць адзін вялізарны недахоп у сваёй рабоце — гэта нізкая прадукцыйнасьць працы. Кулацкі сабатаж, які да гэтага часу заключаўся ў нявыезьдзе ў лес, зараз прыняў новую форму. Рад вёсак раёну (Валевічы, Убель, Юравічы, Хвайнікі, Карпілаўка) возяць такія малыя вазы, што нават сьмешна. На сільным капі вязуць 1-2 двухвяршковыя паленцы. Асабліва адзначаюцца ў гэтым цьвёрдазаданьні Хутарскога, Кліпецкага, Вайнілаўскага і інш. сельсаветаў.

Рабочкомы, вучлесгасаў не займаюцца ўкараненьнем у работу лесарубачных брыгад сацыялістычных мэтадаў працы. Прыклады работы лепшых лесарубаў і возчыкаў не перадаюцца ў масу.

Паступіў самы адказны час лесазагатовак і вывазкі — сакавік. Гэты месяц павінен забясьпечыць поўнае выкананьне квартальнага заданьня.

ТРЫБУНА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

МАЙСТРЫ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

ГАСПАДАРСКАЕ ВОКА

У лютым маразы, часам цальнюткі ні пачамі працавала брыгада цесьляроў калгасу «ЧЫРВОНЫ ГАЙ». За тры месяцы яна пабудавала стайню на 80 коняй, рымарню, кузьню, сьвіран, клюб і г. д.

Зьмяніў выгляд «Чырвоны гай». Пашырыўся, новыя будынкі занялі ўсё месца аж да самай рэчкі. Зьмяніліся і людзі. Перадавыя калгаснікі сталі ўдарнікамі. Вось яны: Несьцяронак Янка, Несьцяронак Павал, Барташ Рыгор, Кратовіч Мікола, Гуранок Сьцяпан, Чарныш Флор, Русецкі Васіль, Барташ Мітрафан і іншыя.

Гэта тыя, што і ўдзень і ўночы змагаліся, каб калгас «Чырвоны гай» поўнасьцю скончыў усе будаўнічыя работы да пасеўнай кампаніі.

Ёсьць яшчэ, аднак, і такія, што—калі хочуць — працуюць, а не—лякаць сабе па печы. Забалоцкі Павал, Касановіч Рыгор, Русецкі Максім—гэта заўзятыя прагулышчыкі, якія тармазілі ўсю работу калгасу.

Іх трох запісьлі на чорную дошку і прахвацілі ў пасьценній газэце. Гэта дало свае вынікі. Забалоцкі Павал ледзь не заплакаў:

— Здымеце з чорнай дошкі, папраўлюся, дайце веры.

Рознымі сродкамі, рознымі шляхамі калгас умацоўвае працоўную дысцыпліну сярод калгаснікаў: цярплівым растлумачэньнем і рашучым адміністрацыйным нацыскам, прэміяваньнем лепшых ударнікаў і занясеньнем гультаёў на чорную дошку.

Так працуе новы старшыня т. БАРДЗІЛОЎСКІ, якому старое кулацкае кіраўніцтва калгасу пакінула напалову разбураную гаспадарку.

Новы старшыня дабіўся ўжо шмат чаго. У сухім, адбудаваным сьвірне ляжыць насеньне для сяўбы. Насенныя фонды поўнасьцю ссыпаны. На некаторых культурах плян ссыпкі па сеўных фондаў значна перавышан. Калгас павінен быў ссыпаць 58 цэнтнэраў ячменю, а ссыпаў—80. Па пшаніцы плян ссыпкі перавыкананы амаль на 5 цэнтнэраў, па бульбе на 16 і г. д.

За ахову насенных фондаў адказвае спэцыяльна прымацаваны да сьвірна член праўленьня калгасу. Усё насеньне поўнасьцю ачышчана і адкартавана.

У новай кузьні, пабудаванай калгасам, скончан рамонт плугоў. Плугі ляжаць у спэцыяльным памяшканьні разам з новым с.-г. інвэнтаром, набытым за апошні час. У другім памяшканьні стаяць радамі адрамантаваныя калёсы. Іх тут 25 штук, апроч дзесяці новых. Рамантуюцца шчэ дзесяць, але гэта, як кажуць тутэйшыя гаспадары, «на ўсякі выпадак».

Калгас «Чырвоны гай» з поўным правам можа гапарыцца сваёй стайняй. Яна новая, цёплая, старанна прыбраная, усюды, у кожным куточку відаць гаспадарскае вока.

Раней, калі ў праўленьні калгасу сядзелі кулацкія элементы, коняй проста калечылі. Новы старшыня калгасу перадаў конскае пагалоўе ў рукі праверэных людзей, сапраўдных калгаснікаў-ударнікаў.

І яны дружна і самаадцана ўзяліся за справу. За кароткі час конюхі-ўдарнікі пастаўлілі на ногі 15 зусім заняпалых і пакалечаных коняй.

Зараз калгас мае 62 коні, з якіх толькі 10 «пастаўлены на рамонт». Усе іншыя коні маюць добры, спраўны выгляд і поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы. Кожны конюх адказвае за 10 коняй. Конскае пагалоўе забясьпечана кармамі.

Асабліва сумленна і адмана працуе конюх АЛЕСЬ БАРНАТОВІЧ. Кулацкія элементы ў мінулым ня раз збівалі Алеся за тое, што ён сумленна пільнаваў калгасную маемасьць і абаранаў коня ад рук кулака-шкодніка. Ворагі калгасу —заможнікі Маклакі ня раз прабавалі ўкрасьці зброю, або проста пакалечыць коняй.

Але Алесь Барнатовіч ня спаў. Ён быў на варце. Алесь выкрыў кулацкія махінацыі Маклакоў і адтаравай коняй ад шкоднікаў. Алесь паказаў, як кожны сумленны калгаснік павінен адносіцца да калгаснай маемасьці, як ён павінен ахоўваць калгасную ўласнасьць.

Пасеўныя пляны ў калгасе «Чырвоны гай» даведзены да брыгад і растлумачаны кожнаму калгаснику. У брыгадзіра Лядняка, калі ён выхадзіў разам са сваёй брыгадай у поле на праверку гатоўнасьці да сяўбы, у кішэні ляжалі старанна складзеныя паперы. Гэта—брыгадны пасеўны плян. Брыгадзір на памяць ведае кожны графік свайго пасеўнага заданьня.

У канцылярыі калгасу на вялізнай карце—дакладны плян гаспадарчага ўпарадкаваньня калгасу. На ім выразна акрэсьлен вучастак кожнай брыгады. Усё ўлічана, да апошняй дэталі.

Зараз у калгасе ідзе актыўная пра працоўка севазвароту, які ўводзіцца з надыходзячай вясны.

Посьпехі калгаснікаў, зразумела, толькі пачатак. Наперадзе яшчэ шмат работы. Але і дасягнутыя вынікі ярка паказваюць, што значыць ачышчаць калгас ад кулацкага ахвосьця, што значыць, калі на чале калгасу стаяць сапраўдныя арганізатары калгаснай вытворчасьці.

«Чырвоны гай» падрыхтаваўся да сяўбы. У гэтым яго вялікая перамога.

А. С.

Барыкаўскі раён.

Сёньня праз трыбуну мы паказваем, як перадавыя байцы новай калгаснай вёскі— калгаснікі-ударнікі змагаюцца за арганізацыю калгаснай вытворчасьці, за моцнага калгаснага каня.

„У каго ў руках калгасны конь, у таго ў руках і ўраджай вашых палёў, вашы даходы"—гэты наказ усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў павінен цьвёрда памятаць кожны калгас, кожны калгаснік.

Конюхі-ўдарнікі—Сянкевіч, Алесь Барнатовіч, Гарнастай—паказваюць на справе, як трэба берачы і даглядаць калгаснага каня, як трэба рыхтаваць яго да сяўбы.

Перанясем гэты вопыт у кожны калгас, на кожную калгасную стайню!

Выканім з калгасных радоў пралезшае туды кулацкае ахвосьце, умацуем працоўную дысцыпліну ў калгасах, спаткаем вясну са здаровым і моцным канём!

Дэлегат менскага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў т. СЯНКЕВІЧ
Тав. Сянкевіч лепшы конюх-ударнік калгасу імя Фалько

ПРАЦУЙЦЕ, ЯК СЯНКЕВІЧ

У калгасе імя Фалько—дзьве тысячы гэктараў зямлі, 160 рабочых коняй, малочная і сьвінагадоўчая фэрмы. Гэта самы буйны калгас у Менскім раёне.

...Ідзем у Вязаньскае аддзяленьне калгасу, дзе працуе лепшая брыгада на чале з брыгадзірам т. ПАЛІТАНСКІМ.

З-за бугра паказаліся шэрыя дахі, вышыў новы будынак кароўніка. Падымаемся на ўзгорак і ўваходзім на двор, дзе знаходзяцца калгасныя стайні, інвэнтар і фуражныя фонды.

Тав. Палітанскі паказвае стайні. Тут якраз працаваў старэйшы конюх брыгады тав. СЯНКЕВІЧ. Ён чысьціў скрабніцай каня. Конь угінае бакі, бе капытам: скрабніца ласкоча...

— А ну, пакажы нам, браток, сваіх коняй,—гаворыць тав. Палітанскі.

— Што-ж паказваць, калі ўсе лепшыя коні сёньня ў лесе—на вывазцы лесаматэрыялаў і торфу. Засталіся толькі самыя, што называецца, горшыя...

Тав. Сянкевіч усёж выводзіць коняй на двор. А гэтыя «горшыя» ня могуць стаяць на месцы. Стрыгуць вухам, рвуцца наперад. Іх рослыя сытыя бакі бліскаюць на сонцы. Круглы круп падзяляецца ямкай на дзве часткі, што заўсёды бывае толькі ў добрых, даглядзеных, сытых коняй.

Мы сьмяёмся. Хітра ўсьміхаецца і Сянкевіч. Ніпто сабе горшыя!..

— Я хварэю сэрцам за каня. Не магу абыяк! Конь, ведаеце, любіць доглад.

— Аўса ўсё-ж даем мала,—як-бы мімаходам дадае тав. Палітанскі.

— Верна,—згаджаецца Сянкевіч.

Аўса ў калгасе зараз сапраўды не хапае. Між тым усе коні, нават тыя, якіх тав. Сянкевіч лічыць «горшымі», гатовы хоць сёньня да работы ў полі.

Уся справа ў тым, што калгасьні ні ня енчаць аб недахвацe кармоў. Яны сабралі ўсё, што толькі маглі, пасьля ссыпкі насенных фондаў, каб поўнасьцю забясьпечыць конскае пагалоўе кармамі. На час пасеўнай кампаніі створаны цьвёрдыя кармовыя фонды, якія цалкам забясьпечваюць усіх коняй брыгады.

Адчуваецца, што калгаснікі не шкадуюць часу, каб добра, сапраўды па-гаспадарску даглядзець каня. Коні поюцца, кормяцца і чысьцяцца своячасова.

Кожны конь прымацован да пасоб нага калгасьніка, разам са збруяй і іншым інвэнтаром. Сянкевіч пільна сочыць, каб конь быў даглядзен, не апоен, не замулен, не заедзкан.

Вось у гэтым і сакрэт таго, што коні ў брыгадзе тав. Палітанскага, хоць у калгасе і не хапае аўса, цалкам і поўнасьцю падрыхтаваны да палявых работ. Тав. Сянкевіч—прэміяваны ўдарнік. Ён сапраўды «сэрцам хварэе за каня».

Ідзем туды, дзе ляжаць інвэнтар і машыны. Да сяўбы ўсё гатова. Гатовы калёсы, гатовы плугі, бароны, хамуты. Хамутоў, між іншым, аж па два на аднаго каня.

— Навошта па два?

Брыгадзір растлумачвае, што коні ўлетку худзеюць, хамуты становяцца завялікімі і коні намульваюць сабе карк. З гэтай прычыны і падрыхтаваны другія хамуты—трошкі меншыя.

Насенныя фонды ссыпаны. У гэтым годзе, між іншым, ссыпана куды больш насеньня, чым летась, хоць пасеўная плошча застаецца ранейшай.

Ціха, коратка і проста тав. Палітанскі расказвае як ён і яго брыгада змагаюцца за працоўную дысцыпліну.

— Ох і было! Крута нам спачатку прышлося. Нямала папрацавалі, пакуль наладзілі гэту справу. Раней дысцыпліны ня было ніякай. Адзін сабе, другі сабе. Адзін ідзе на работу, другі сядзіць у хаце. І так да таго часу, пакуль мы, варэшце, не зразумелі, што з гультаямі і прагулышчыкамі цацкацца—проста злачынства. Усялі каго трэба было ў работу. Перад гультаямі паставілі пытаньне проста: сам ня робіш—другіх ня бунтуй, такія нам непатрэбны.

— І дабіліся мы! Дабіліся, што брыгада працуе ўся, як адзін чалавек. Кожны з калгаснікаў ведае справу, кожны нясе адказ за сваю работу.

У мінулым, у першыя часы арганізацыі калгасу, калі прыходзілася туга, калі пралезшыя ў калгас кулакі і падкулачнікі рабілі ўсё, каб да канца разбурыць гаспадарку, шмат хто з калгаснікаў спалохаўся і вярнуўся назад на аднаасобную палоску. Цяпер яны пачынаюць разумець, хто мае рацыю, цяпер яны сваімі вачыма бачаць, што калгас расьце, калгас пашыраецца, што памыліліся яны, а ня тыя, хто застаўся ў калгасе, хто сьмела, ня гледзячы на вялікія труднасьці, змагаўся за ўмацаваньне калгаснай гаспадаркі.

Цяпер аднаасобнікі і асабліва тыя, хто раней выйшаў з калгасу, атакуюць праўленьне заявамі аб прыёме.

— Мы,—кажа тав. Палітанскі,—калі прымаем, дык на слова ня верым, перш глядзім, што ты ўчуляеш з сабе. Патрабуем, каб насеньне вдаў...

У вёсках, дзе знаходзіцца калгас імя Фалько, на сёньнішні дзень засталося толькі 6 аднаасобнікаў.

Ад Вязаньскага аддзяленьня калгасу імя Фалько на зьлёт калгаснікаў-ударнікаў Меншчыны пасланы два дэлегаты: сам брыгадзір тав. Палітанскі і старэйшы конюх тав. Сянкевіч.

М. Ц.

ЯК МЫ ЎЗЬНЯЛІ ЎРАДЖАЙ

У сваёй прамове на ўсесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў тав. СТАЛІН сказаў, што, калі мы будзем добра выкарыстоўваць жашы машыны, добра апрацоўваць зямлю, берагчы наша калгаснае дабро, дык зможам удвойчы павялічыць ураджай, орабіць усіх калгаснікаў ЗАМОЖНЫМІ.

Правільныя словы! Гэта пацьвярджае хоць-бы практычная работа нашага калгасу «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ».

«Чырвоны сьцяг»—гаспадарка малая. Арганізавалі мы наш калгас вясной 1931 г. Раней зямлю ў нашай вёсцы апрацоўвалі абыяк. Ну і вынікі, зразумела, былі хоць плач. Добра, калі ўдавалася зьняць з аднаго гэктара цэнтнэраў шэсьць збожжа, або цэнтнэраў шэсьцьдзесят бульбы. Ня дзіва, што амаль усе сяляне нашай вёскі—беднякі ды таксама сераднякі—ня мелі хлеба да новага ўраджаю і хадзілі батрачыць. Адным словам, ня жылі мы, а марнелі.

А цяпер? Цяпер зусім іншая справа. Цяпер мы жывем па-новаму.

Наш калгас, можна сказаць, падрыхтаваўся да сяўбы. Насеньне мы ссыпалі датэрмінова і куды больш супроць плану. І насенны і страхавы фонды ссыпаны і ачышчаны. Для рабочай жывёлы на ўвесь час пасеўнай загатоўлены кармы.

А вось паглядзеце, што атрымалі нашы калгаснікі ад размеркаваньня даходаў. Нельга і параўнаць з тымі, хто карыстаецца яшчэ вузкай палоскай. На адзін працадзень прыпадае 2,25 кілё збожжа, 1,7 кілё ячменю, 1 кілё аўса, 0,4 кілё пшаніцы, 11 кілё бульбы, паўтара кілё капусты і, апроч таго, 1 р. 55 кап. грашыма. Калгаснікі нашы ня толькі цалкам забясьпечылі сабе прадукт тамі, у іх ёсьць і ліпкі. Дзяржаўным арганізацыям члены нашага калгасу ўжо прадалі ў параўнаньні калгаснага гандлю 50 пудоў збожжа.

Што-ж нам забясьпечыла такія працадні? А тое, што мы ўсур'ёз узяліся за арганізацыю працы і ня цацкаемся з гультаямі, сьвядома, па-гаспадарску адносімся да зямлі.

Праўда, калі наш калгас толькі арганізаваўся, мы ня мелі мачымасьці, як сьлед, падрыхтавацца да пасеўнай кампаніі. У калгас мы аб'ядналіся 8 мая 1931 г. Прышлося сеяць, сьпяшаючыся, не падрыхтаваўшы зямлі.

Але як толькі скончылі сяўбу, так прыблізна з першых дзён чэрвеня мы і пачалі рыхтаваць прызначаную нам аблогу, гэта тую самую зямлю, якую аднаасобнікі не хацелі абрабляць, бо яна не аплачвала ім іхняе працы.

Мы гэту зямлю ўзаралі, потым, перад касавіцай, пабаранавалі, вывезлі гной і за тры тыдні да азімай сеяў шамяналі. Астатнюю зямлю, на якой мы меркавалі ў 1932 годзе пасеяць ячмень, капусту і буракі,—мы ўзаралі пад заб.

А вось ужо летась мы мелі больш мачымасьцяй папрацаваць над зямлёй. І папрацавалі!

Да пасеўнай кампаніі пачалі рыхтавацца яшчэ ў студзені. Перш за ўсё увялі дакладныя нормы выпрацоўкі і вызьвольнічыну, наладзілі ўлік. Калгаснікі за работу ўзяліся дружна. Правільнае размеркаваньне ўраджаю ў 1931 годзе па колькасьці і якасьці працы ўшчэнт разьбіла кулацкія байкі аб тым, што колькі ні працуй—слава і плата адна. Хто лепш працаваў, хто сумленна адносіўся да работы, той і больш атрымаў. Гэта ўмацавала працоўную дысцыпліну. Мне, як старшыні калгасу, больш ня прыходзілася прасіць калгаснікаў выходзіць на работу.

Перш за ўсё, мы вывезьлі гной. За зімовы час вывезьлі толькі пад агародніну ды пад раннюю бульбу. Апроч таго, вывезьлі і мінэральнае ўгнаеньне.

Аралі мы глыбока. Якасьць ворыва я сам правяраў. Агрохаў у нас ня было. Пасьля ворыва—два разы прайшлі бараною «Зіг-заг». Потым сеялі, спружынавалі і яшчэ раз-другі прайшлі бараной. Такім чынам, зерня ляжала ў зямлі, як у пуху.

Усю гэту работу—і падрыхтоўку, і самую сяўбу—мы правялі за 20 дзён. Пасеў збожжавых і гародніх культур праходзіў у нас ня больш, як чатыры-пяць дзён.

Усё лета мы таксама не забывалі пра нашы пасевы. Гародныя і прапашныя культуры, дзе два, а дзе і тры разы, як да глебы,—палолі. А прышла восень—не чакалі пакуль збожжа пачне асьпяцца, а за некалькі дзён да поўнай сьпеласьці пачалі жаць. Уборка збажыны праходзіла шэсьць дзён.

Так мы працавалі. І праца не прапала даўма.

Ураджай у нас ужо ня тый. У 1931 годзе мы з аднаго гэктара зьнімалі па 6, самае лепшае — па 6,5 цэнтнэраў збожжа. Бульбы калі зьбіралі па 85 цэнтнэраў з гэктара, дык гэта ўжо было сусім добра. Гародніны больш, як па 115 цэнтнэраў з аднаго га, мы ня мелі.

А вось, што мы атрымалі ў мінулым годзе з тэй самай аблогі, на якой у аднаасобнікаў нічога не расьцла. Збожжа мы сабралі па 11 і больш цэнтнэраў з гэктара. Ураджай ячменю дасягнуў у сярэднім 17 цэнтнэраў, а бульбы—120. Буракоў мы сабралі з аднаго гэктара па 200 цэнтнэраў і капусты—па 250. Толькі авёс, які мы прымушаны былі з-за зямляўпарадкаваньня сеяць на аўсяніцы, даў нам з гэктара па 8,5 цэнтнэра.

Яснае пытаньне—высокі ўраджай залежыць толькі ад нас. Мы можам і павінны зьбіраць яшчэ больш ураджай. Толькі-б хацелі рабіць, рабіць сумленна, рабіць па-гаспадарску, плянава і арганізавана, абы ня даць пралезшай ў калгас нашаму зьлейшаму ворагу—кулаку, абы выгнаць з калгасных радоў кулацкае ахвосьце, а зямля... Зямля не пазволіць.

МЯДЗЬВЕДЗКІ.

Старшыня калгасу «Чырвоны сьцяг», дэлегат раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў.

АРШАНСКІ раён.

ДЭЛЕГАТ ІВАН БЯЦЬКОЎСКІ

— Трэба сьпяшацца, сёньня ў нас важны сход,—сказаў калгаснік Юркоў Андрэй сваёй жонцы Ганне.—Хіба ня ведаеш, сёньня лепшы калгаснік нашага раёну—Бяцькоўскі Іван зробіць справаздачу аб зьезьдзе ў Маскве. Ёнжа чуў самаго Сталіна, значыць нешта скажа...

Даяркі хутка падаілі кароў, конюхі заклалі коням у драбіны сена. Усе сьпяшаліся на сход.

Дом праўленьня калгасу «Колас» да адказу запоўнен народам. Тут сабраліся калгаснікі 3-х калгасаў: «Колас», «Ударнік» і «Непераможны». Усе з нецярплівасьцю чакалі выступленьня дэлегата.

Нарэшце, загаварыў і ён—Бяцькоўскі Іван—дэлегат першага ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

— Я сказаў тав. Бяцькоўскі,—праслухаўшы першага калгасьніка-ўдарніка тав. Сталіна, хачу падзяліцца з вамі, каб і вы ведалі, што нам зараз трэба рабіць.

Першае і галоўнае—уздым ураджайнасьці. А для таго, каб гэтага дамагчыся, патрэбна дысцыпліна, моцная працоўная дысцыпліна, братцы.

Восьмем, прыкладам, маскоўскіх рабочых. Яны выгналі дадыраў і прагульшчыкаў са сваіх фабрык і заводаў. Так і нам трэба зрабіць.

— Вось і ў маім калгасе «КАМІНТЭРН», Спасоўзнага сельсавету, пасьля таго, як я прыехаў і расказаў калгаснікам аб зьезьдзе, сход аднагалосна пастанавіў гнаць подыраў з калгасу. Тут-жа на сходзе былі выключаны чатыры падкулачнікі, якія шкодзілі нам у рабоце.

— Рыхтуючыся да ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, мы асабліва ўвагу зьвярнулі на цягавую сілу. Пасьля таго, як мы ачысьцілі калгас ад кулакоў, у нас з коньмі лепш стала. Мы вылучылі 3-х конюхаў, да кожнага прымацавалі пэўных коняй.

Прайшло ўсяго 15 дзён, а конь ужо стаў зусім другім. Коні штодзенна чысьцяцца, своячасова напоены і накормлены. За кожным калгаснікам замацавана парка коняй са збруяй, за якіх ён і адказвае.

— Кожны калгаснік павінен у 1933 годзе выпрацаваць ня менш 250 працадзён,—так мы пастанавілі. Так павінны паступіць і вы.

Пасьля Бяцькоўскага выступалі прад стаўнікі калгасаў, гаворачы, што робіць па падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы. Ва ўсіх 3-х калгасах насенныя фонды ўжо даўно ССЫПАНЫ І АЧЫШЧАНЫ. Інвэнтар прыведзен у баявы перадан.

Да зьезду актыўна рыхтуюцца і ў іншых калгасах. Вось калгас «ЭНЭРГІЯ», Хрыплёўскага сельсавету. На зэкліп перадавікоў калгаснай будоўлі ён адказвае канкрэтнымі справамі. Насенны і страхавы фонды на вызначаную плошчу ў 159 га ссыпаны і ачышчаны. Насеньне адсартавана. Галоўную ўвагу калгаснікі зараз аддаюць падрыхтоўцы каня. Дасе больш слабых коняй вызвалены ад работы і пастаўлены на ўзмоцнены падкорм. На час сяўбы вызначан фуражны фонд —800 пудоў канцэнтраваных кармоў.

У калгасе «КОЛАС», Гарадзішчанскага сельсавету, уся работа праходзіць пад лёзунгам—рапартаваць зьезду аб поўнай падрыхтаванасьці да сяўбы. Насенны і страхавы фонды ссыпаны і ачышчаны. Ахова насеньня даручана лепшаму калгасьніку, члену праўленьня, ХАРЛАМАВУ Антосю.

Харламаў на сходзе перад усімі калгаснікамі абавязаўся захаваць насеньне да самага выхаду ў поле. Першыя дні работы паказваюць, што ён свой абавязак выконвае з гонарам. Кожны засек належна адрамантован, указана вага ссыпанага насеньня.

Калгаснікі арцелі «Шлях сацыялізму», Чырвонапольскага сельсавету, вы конваючы дырэктывы правадыра партыі т. Сталіна і зьезду калгаснікаў-ударнікаў, ачысьцілі свае рады ад шкоднікаў і подыраў, якія пралезлі ў калгас і раскрадвалі калгасную маемасьць. Падкулачнікі Французаў, Германовіч, Карпушоў, Князеў, Камусенка, Пракапенка і Карпушынскі, якія падрывалі гаспадарку, выкінуты з калгасных радоў. І работа цяпер пашла зусім інакш. Узьнялася працоўная дысцыпліна. Калгаснікі зараз чысьцяць насенне, зьбіраюць попел. Кожны абавязаўся сабраць ня менш 50 кілё попелу.

МАГІЛЕЎСКІ раён.

Дэлегат менскага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў т. ЯН МАЛІНОЎСКІ

Ян Маліноўскі

Каваль-ударнік калгасу імя Фалько

Улічылі кожную гадзіну

Наша брыгада кавалёў складаецца з 4-х калгаснікаў. Праўленьне і калгасны сход сказалі нам цьвёрда:

— Што хочаце, а каб да 15-га лютага рамонт машын і інвэнтару быў скончан.

Цяжкавата, зразумела, было, але нічога, мы не спалохаліся, з задачай сваёй справіліся, увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны адрамантавалі за 7 дзён раней тэрміну.

Чаму нам удалося так добра выканаць заданьне праўленьня і калгаснага сходу? А таму, што сілы свае правільна разьмеркавалі, кожнаму далі пэўную нагрузку, строга вызначылі кожную гадзіну. Працавалі мы па плану. Загадзя ўстанавілі, колькі плугоў, боран і г. д. трэба адрамантаваць за пэўны час, якую работу трэба выканаць за дзень.

І яшчэ адно — гэта дысцыпліна. Уся наша брыгада сумленна адносіцца да сваёй работы. За ўвесь час ні адзін каваль не зрабіў прагулу і ні разу не спазьніўся на работу. Цяпер мы бяромся за рамонт уборачных машын. Нельга гэтай справы адкладваць.

Калгас мяне паважае. Мяне выбралі дэлегатам на першы зьлёт калгаснікаў-ударнікаў Менскага раёну. Пастараюся апраўдаць гэта высокае давер е.

Б. Гарнастай

Калгаснік-ударнік калгасу імя Фалько

Мой шлях

Галеча, што не пакідала нашай сям'і, прымусіла мяне з дзесяцігадовага ўзросту пайсьці ўжо батрачыць да мясцовых кулакоў, Шкурдаў, Стальмашэўскіх, Бялькевічаў і інш. Хлапчуком у 12-14 год я ўжо разам з дарослымі выконваў усе сельска-гаспадарчыя работы. Амаль круглы год працаваў толькі за харчы.

Пасьля 6 год працаваў пастухом, пасьлі жывёлу вакольных вёсак — Вязанка, Чаркасы і іншых. Нямала розных пакутаў давялося перанесьці і пуг. Жыцьцё яшчэ больш пагоршылася, калі стаў сямейным. Сваёй хаты я ня меў і заўсёды вандраваў.

Узьнятыню сапраўды вольна ўздыхнуў я ў 1929 годзе, калі выселілі кулакоў, а на іх зямлі, дзе раней за кавалак хлеба, спыняючы потам, працавала беднота, арганізаваўся калгас імя тав. Фалько. Дзесяткі бедакоў, у тым ліку і я, першымі ўступілі ў калгас.

Зямляніася аблічча і зямлі. Зруйнавалі межы. Па дапамогу нам прыйшла дзяржава, дала машыны, крэдыт.

Зараз я ўсім забясьпечан. Маю даволі прадуктаў і грошай. За тры гады жыцьця ў калгасе я стаў ЗАМОЖНЫМ, маю хату. У мінулым годзе я выпрацаваў 561 працадзень і атрымаў пры разьмеркаваньні 46 пудоў 34 ф. жыта, звыш 7 пуд. ячменю, каля 5 пуд. пшаніцы, 112 пуд. бульбы і 412 руб. грашыма.

Для маёй сям'і, якая складаецца з трох душ, гэта больш чым даволі.

У апошні час я працую конюхам, даглядаю 13 коняй. Коні ў мяне заўсёды ў добрым стане. Са сваімі конямі я хоць зараз у поле магу выйсьці. Гэта пацьвердзіла і камсамольская брыгада, што гэтымі днямі правярала падрыхтоўку нашага калгасу да сяўбы.

Адным словам—сумленна працуй і будзеш добра жыць.

Ганна Стракач

Калгасьніца-ўдарніца калгасу імя Фалько

Што было, што ёсьць

З 9 год пачала я працаваць у мясцовых кулакоў Навіцкага, Міхайлава, Шынкі і іншых. Так батрачыла амаль 26 год — пакуль ня ўступіла ў калгас.

Замужняй стала — дабавіліся яшчэ сямейныя клопаты — згатаваць страву, дзяцей даглядзець, бялізну памыць. Асабліва цяжка было ў жніво. На поле хадзіла з дзіцем за плячыма, мала сьпяла да цямна.

У 1930 годзе ўступіла я ў калгас. Зразумела, спачатку — абе-тое, трохе-ж усё, на прыбылка. Але нічога, не спалохалася. Сапраўднае жыцьцё пачалося для мяне толькі ў калгасе. Тут я пазнаёмілася.

Я ўдарніца. Працую, як толькі магу—ад сэрца. Калгасных дзяцей, што я даглядаю, берагу, як вока. І вось я, што век сядзела без свайго хлеба, стала ў калгасе заможнай. За мінулы год выпрацавала я столькі, што і сама, і дзіця маё добра забясьпечаны. Атрымала я 22 пуды збожжа, 53 пуды бульбы, ячменю, пшаніцы ды яшчэ грашыма.

Калгас раз і назаўсёды вызваліў мяне ад хатніх клопатаў. Па турбоце мяне зараз маё дзіця. Вось ужо тры гады ў калгасе бесьперабойна працуюць дзіцячыя ясьлі. Дзіця маё своячасова накормлена і напоена. Бацькаўскія клопаты ўзяў на сабе калгас.

Аб падрыхтоўцы рамонту трактараў

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

1. ЦК КП(б)Б і СНК канстатуюць, што ў ходзе рамонту трактараў няма адзінак пералому і што ёсьць яўная пагроза зрыву свачасовага (да 15-га сакавіка) рамонту.

ЦК і СНК тлумачаць гэты нездавальняючы ход рамонту ў першую чаргу адсутнасьцю канкрэтнага, апэрацыйнага, уваходзячага ва ўсе дэталі справы, кіраўніцтва як з боку НКЗ (яго трактарных аб'яднаньняў), Упаўнаркамсаўгасаў (і яго трэстаў), так і з боку райкомаў, РВК, дырэктараў і сакратароў ячэек МТМ, МТС і саўгасаў.

Ганебнымі, нявартымі бальшавіцкоў выяўляюцца тэмпы рамонту трактараў і матораў па Гарадоцкай, Горацкай, Клімавіцкай, Камарынскай і Сеньненскай МТМ, па Менскім, Магілеўскім сьвінаводтрэстах, Гомельскім Малірамтрэсьце і Племсьвінтрэсьце, па Бешанковіцкай, Оўраскай, Крупскай, Чавускай, Барысаўскай, Жлобінскай, Магілеўскай МТС.

ЦК і СНК лічаць неабходным зьняць з работы з перадачай справы ў ЦКК дырэктара Гарадоцкай МТМ Ляпогу і Шклоўскай МТС Зеляпкоўскага.

Адклікаць, як ня справяўшагася з работай і не забясьпечыўшага бальшавіцкіх тэмпаў работы, упаўнаважанага ЦК па Гарадоцкай МТМ т. Даўгапольскага; абвясьціць вымову дырэктарам Бешанковіцкай, Оўраскай, Жлобінскай МТС т. т. Агееву, Кавалёву і Ракаву.

Указаць упаўнаважанаму ЦК і СНК па Воршы тав. Чарнышову, што ён да гэтага часу не забясьпечыў пералому ў рабоце Аршанскай МТМ, зав. «Чыр. барацьбіт», Аршанскага Сьвінаводтрэсту і аршанскага складу Белснабрамонту. Папярэдзіць т. Чарнышова, што калі да 12 сакавіка ня будзе забясьпечана рашучага пералому, ЦК і ЦКК прымуць больш суровыя меры спагнаньня. Папярэдзіць усіх дырэктароў трактарных цэнтраў і саўгасных трэстаў, дырэктароў і сакратароў ячэек МТМ, МТС і саўгасаў, прадпрыемстваў, якія рамантуюць трактары і выробляюць запчастакі, сакратароў ГК і РК КП(б)Б і ўпаўнаважаных ЦК і СНК, што ЦК і СНК дадуць да 17 сакавіка ацэнку кожнаму з вышэйпаказаных таварышоў пад кутом гледжаньня таго, як яны забясьпечылі сканчэньне рамонту ў тэрмін і што ЦК і СНК будуць зьнімаць няспраўіўшыхся з працай работнікаў, ня гледзячы на асобы.

2. Улічваючы, што ні трактарныя цэнтры, ні Белснабрамонт не забясьпечваюць неабходных у даны момант бальшавіцкіх тэмпаў работы, лічыць неабходным на перыяд рамонту прымацаваць у якасьці ўпаўнаважаных ЦК і СНК наступных таварышоў: Файнгаўза — да Гародня-бульбянага трактарацэнтру; Сакаленка — да Збожжатрактарацэнтру; Вайновіча — да Ільнатрактарацэнтру; Рохкінда (аргінструктар ЦК КП(б)Б) — да Белснабрамонту.

Ускласьці пэрсанальную адказнасьць за ход рамонту трактараў па МТС на сакратароў РК, як упаўнаважаных ЦК і СНК. Ускласьці пэрсанальную адказнасьць за чоткую работу складаў: «Саўгаспрамонту — на тав. Сьмірнова, Белснабрамонту: Менскага — на тав. Бущіка, Аршанскага — тав. Чарнышова, абавязаўшы іх штодзенна правяраць і дапамагаць у рабоце складу.

3. Улічваючы, што найбольш вузкім месцам у ходзе рамонту трактараў зьяўляецца даставка запчастак і недахоп бабіту, —

а) абавязаць прадпрыемствы штодзенна адгружаць запчасткі і ў тэлеграфных зводках указваць аб наяўнасьці на заводзе неадгружаных запчастак. Забараніць прадпрыемствам адгружаць запчасткі ў адрас складаў Белснабрамонту і саўгасаў;

б) абавязаць склады ўказаных арганізацый занараджваць і адпраўляць на пункты рамонту трактараў грузы, якія атрымліваюцца па саюзных разнарадках, не пазьней, як праз 24 гадзіны з моманту атрыманьня грузу;

в) абавязаць дырэктароў прадпрыемстваў не пазьней 48 гадзін са дня апублікаваньня гэтай пастановы паведаміць у Цэнтрапасаўком аб колькасьці наяўнага бабіту Б-1 і волава.

Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў не пазьней 11 сакавіка тэлеграфна паведаміць у Цэнтрапасаўком аб лішках бабіту, папярэдзіўшы іх, што ўсякая спроба ўхіленьня ад пасылкі бабіту ў МТМ і прадпрыемствы, у якіх рамантуюцца трактары і маторы данага саўгасу і МТС, будзе разглядацца, як крымінальная справа;

г) разьвярстаць не пазьней 14 гадзін 8 сакавіка па МТМ і прадпрыемствах, вырабляючых запчасткі, бабіт і волава, выяўленыя згодна тэлеграмы тав. Гікало.

4. У сувязі з тым, што частка запчастак асядае ў МТС і саўгасах і дырэктары апошніх не пасылаюць на месца рамонту сваіх трактараў належную колькасьць запчастак, прапанаваць РКК-РСІ, пад пэрсанальную адказнасьць старшынь, праверыць гэтыя факты не пазьней 10 сакавіка, прыняць неадкладна апэрацыйныя меры да высылкі гэтых запчастак у МТМ і прадпрыемствы, паведаміўшы аб прынятых мерах у Цэнтрапасаўком не пазьней 11 сакавіка.

5. Прапанаваць РК, дырэктарам і ячэйкам МТМ, МТС і саўгасаў неадкладна перабудаваць работу гэтых прадпрыемстваў, увёўшы трохзьменную работу, вылучыўшы вядучыя групы, склаўшы выразны графік работы, ліквідаваўшы абязьлічку ў працэсе рамонту трактараў і г. д.

Прапанаваць РК, дырэктарам і ячэйкам МТМ, МТС і саўгасаў прыняць неадкладныя меры да ачысткі іх ад клясава-чужых і шкодніцкіх элемэнтаў.

6. Канстатуючы, што на 5 сакавіка ні НКЗ, ні Упаўнаркамсаўгасаў не даставілі на прадпрыемствы Белмэталяабʼяднаньня ўсіх прызначаных трактараў, прапанаваць тав. Рачыцкаму і Жолудаву не пазьней 12 гадзін 8 сакавіка прадставіць неабходную разнарадку і асабіста прасачыць за свачасовай даставкай трактараў на прадпрыемствы.

7. Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў адгружаць з МТМ і заводаў адрамантаваныя трактары ня больш, як праз 24 гадзіны з моманту прыёму камісіяй і ня больш, як праз два дні са дня сканчэньня рамонту.

8. Абавязаць тав. Амбражуласа і дырэктароў прадпрыемстваў зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць вырабляемых запчастак. Адначасова ўскласьці пэрсанальную адказнасьць на тав. Рачыцкага за выпрабаваньне і адказку адрамантаваных трактараў і запчастак.

9. Абавязаць тав. Амбражуласа і дырэктароў прадпрыемстваў фарсаваць выраб тых дэталяй (напрыклад, гільзы), з-за якіх тармозіцца рамонт трактараў.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Ход рамонту трактараў
(На 9 сакавіка 1933 году)

НАЗВА СЫСТЭМЫ	Заданьне	Адрамантавана	Процант выкананьня пляну
1. Ільнатрактарацэнтр (дыр. тав. Селіванаў)	623	324	52,0
2. Збожжатрактарацэнтр (дыр. тав. Дубоўскі)	342	228	66,7
3. Гароднябульбатрактарацэнтр (дыр. тав. Грабенчык)	517	313	60,5
4. Разам па сыстэме НКЗБ	2137	1106	51,8
5. Па НК Саўгасаў (тав. Сьмірноў)	700	293	41,9
Разам па БССР	2837	1404	49,6

Увага: Даныя па гародня-бульбатрактарацэнтру—на 10 сакавіка

ДА 50-ЦІГОДЗЬДЗЯ З ДНЯ СЬМЕРЦІ КАРЛА МАРКСА

У сувязі з 50-цігодзьдзем з дня сьмерці Карла Маркса прозыдыум ЦСПСБ прапанаваў усім гарпрафсаветам і ФЗМК правесьці па ўсіх прадпрыемствах з 13 сакавіка па 1 красавіка спэцыяльныя сходы рабочых, прысьвечаныя жыцьцю і дзейнасьці Маркса.

Культаддзел ЦСПСБ сумесна з Акадэміяй навук Беларусі вылучыў групу таварышоў для правядзеньня дакладаў на буйных прадпрыемствах Гомелю, Віцебску, Магілева, Бабруйску, Мазыра і інш.

У клюбах і бібліятэках з 13 сакавіка па 10 красавіка будуць арганізаваны выстаўкі-вітрыны твораў Карла Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.

Пры выстаўках будуць праводзіцца гутаркі з чытачамі, а таксама будзе разгортвацца работа па прасоўваньні твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна ў шырокія рабочыя і працоўныя масы.

Прозыдыум ЦСПСБ падкрэсьліў, што правядзеньне 50-годзьдзя з дня сьмерці К. Маркса павінна праводзіцца пад лёзунгамі папулярызацыі вучэньня Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна сярод шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас.

Паведамленьні

ЦК і ЦКК КП(б)Б паведамляюць, што 15 і 16 сакавіка 1933 г. ў Клімавічах будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Клімавіцкага і Касьцюковіцкага раёнаў.

Намі выклікаюцца наступныя таварышы:

На 15 сакавіка 1933 г., Касьцюковіцкі раён: Чарнікоў Я., Максімаў А. С., Сапранаў А. І., Шкаленка С. М., Мельнікаў Д. Ф., Анжэнка С. І., Падабед Д. Ф., Хвяжэтаў Р., Бабакін Л. П., Анціпенка Я., Мялешчанка А. К., Кісялёў Н. Д., Самахвалаў П. Ф.

На 16 сакавіка 1933 г., Клімавіцкі раён: Кірыдёнак А. М., Данілаў В. Ф., Седнеў Н. Л., Івейдзікаў Р. Н., Бляхін С. М., Красоўскі, Левікаў Е. М., Давыдаў М. Х., Бельчук Е. Р., Алексеенка П. Т., Зайцаў І. А., Карнеенка Е., Курылаў Я. М., Лукʼянцаў, Падабед Я. В., Васілеўскі С. М., Паршукоў Я. Ц.

Яўка памянёных таварышоў абавязкова.

Да дня разгляду спраў неабходна прадставіць ПТ характарыстыкі ячэек аб апошняй рабоце т.т.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

— Культсэкцыі гаркому КП(б)Б прапануе кніжнымрымальнікам з бібліятэкі клюбу імя Карла Маркса зьвярнуць кніжкі ў 5-дзённы тэрмін у бібліятэку. Ня зьвярнутыя ў паказаны тэрмін кніжкі будуць спагнаяцца і кніжнымрымальнікі будуць пазбаўлены права на атрыманьне ў дадатковым кніжак з бібліятэкі. Прыём праводзіцца ў бібліятэцы кожны дзень з 6 да 8 гадз. вечара. Уваход з вуліцы Энгельса.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. Балціна — был. сакратара Нараўлянскага РК КП(б)Б, Карсеко — б. старшыню РВК і Булазава — б. старшыню РайКК-РСІ зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б—Менск, Савецкая, 55, 3-ці паверх, 18 пакой. Просьба да ўсіх пэрсанальнасьцей, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёных таварышоў, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАНАВА.

Польска-данцыгскі канфлікт абвастраецца

Куляйёты на вуліцах Данцыгу

ВАРШАВА, 9. Абурэньне ў Данцыгу ў сувязі з узмацненьнем колькасьці польскіх войск на Вестэрплятэ расьце. Паліцэйскія пасты ўзмоцнены грамадзянскай паліцыяй і ўзброены вінтоўкамі. Ля польскіх устаноў — моцная ахова. На вуліцы высланы грузавікі з паліцэйскімі ў баявой гатоўнасьці і з куляйётамі. Агенцтва «Іскра» ў паведамленьні ад 8 сакавіка піша: «Усеагульнае зьдзіўленьне выклікаў сёньня ад'езд кіраўніка данцыгскіх нацыянал-сацыялістаў дэпутата Фрэзэра ў Бэрлін. Гавораць, што ён выехаў, каб атрымаць новыя інструкцыі ад цэнтральных органаў нацыянал-сацыялістаў».

Учора на пасяджэньні савету старэйшын Данцыгскага фолькстагу было пастаноўлена заявіць пратэст супроць парушэньня Польшчай згоды з Данцыгам і яе агрэсыўных мкненьняў. Па прапанове рады старэйшын, пасьля адкрыцьця фолькстагу ў адзнаку пратэсту супроць паводзін Польшчы было вырашана адтэрмінаваць пасяджэньне на адзін дзень. Польскае агенцтва перадае, што камісар Лігі нацый у Данцыгу зьвярнуўся па тэлеграфу да генэральнага сакратара Лігі з просьбай тэрмінова паставіць на пасяджэньні рады Лігі пытаньні аб данцыгскай партовай паліцыі — на падставе польскага пратэсту супроць узмацненьня польскай ваеннай аховы. Камісар Лігі ў Данцыгу выяжджае сёньня ў Жэнэву.

Усе польскія газэты перадрукоўваюць сёньня сэнсацыйнае паведамленьне «Дэйлі геральд». У паведамленьні гаворыцца, што польскі ўрад мае доказы таго, што нацыянал-сацыялістская канспірацыйная ячэйка падрыхтоўвае замах па Вестэрпляц.

«Усё паказвае на тое, — піша «Дэйлі геральд», што гэта тыя-ж штурмавікі, якія падрыхтавалі і паскорылі падпал рэйхстагу. Сярод нацыянал-сацыялістаў ёсьць моцная трупа актыўных тэрарыстаў, адказных за зробленыя на працягу мінулага году шматлікія забойствы».

Нацыянальны даход ПАЗШ бязупынна зьмяншаецца

НʼЮ-ЁРК, 9. Паводле папярэдняй ацэнкі статыстычнай арганізацыі «Нойшэнал Індустрыяль», нацыянальны даход Злучаных Штатаў у 1932 годзе скараціўся прыблізна на 53 проц. параўнаўча з 1929 г. і складаў 40 мільярдаў даляраў. Па даных гэтай арганізацыі, нацыянальны даход у 1931 годзе складаў 52,7 мільярда ў цяперашніх далярах і 37,9 мільярда ў «далярах 1913 году». Адпаведныя лічбы для 1930 году—70,7 млрд. даляраў і 45,8 млрд. даляраў, а для 1929 году — 85,2 млрд. даляраў і 53,1 млрд. даляраў. Зьмяншэньне нацыянальнага даходу паміж 1919 і 1921 гадамі складала такім чынам 38,2 ў цяперашніх далярах і 28,7 «у далярах 1913 году».

Японія патрабуе вываду кітайскіх войск з Цзяньцзіну

ШАНХАЙ, 9. Па паведамленьні кітайскіх газэт, учора японскі консул у Цзяньцзіні прадʼявіў ультыматум кітайскім уладам, патрабуючы вываду кітайскіх войск з рабну Цзяньцзіну і пагражаючы «прыняць адпаведныя меры ў выпадку адмаўленьня выканаць гэта патрабаваньне».

Пагоршаньне адносін паміж Аўстрыяй і Германіяй

ВАРШАВА, 8. Пэпэсаўскі «Роботнік» паведамляе аб пагоршаньні адносін паміж Германіяй і Аўстрыяй. «Зараз няма ў Аўстрыі такой палітычнай трупы, якая дабівалася-б далучэньня да гітлераўскай Германіі, — заяўляе газэта. — Апрача таго, выкрылася, што цры дапамогае германскіх банкіраў Гітлер вёў спэкуляцыйную ігру, дабіваючыся падзеньня аўстрыйскай валюты і падпарадкаваньня Аўстрыі германскім банкам... Выкрыцьцё гэтых праделак, — піша «Роботнік», — значна ахаладзіла сымпатыі Аўстрыі да Германіі».

Японія выходзіць з Лігі нацый

ТОКІЁ, 9. Па паведамленьні «Сінбун Рэнго», рада міністраў 8 сакавіка зацьвердзіла праект ноты, якая паведамляе Лігу нацый аб выходзе Японіі з Лігі. Нота перадана на зацьвярджаньне тайнай рады і лічыцца нясумненным, што тайная рада створыць звычайную ў такіх выпадках «дасьледчую камісію» і на працягу тыдню закончыць усе фармальнасьці. Нота будзе адпраўлена каля 20 сакавіка.

Пратэст амэрыканскага ўраду

ВАШЫНГТОН, 9. Дзяржаўны дэпартамант паведамляе, што ў сувязі з гвалтамі над амэрыканскімі грамадзянамі ў Германіі, ім заўлён пратэст германскаму ўраду. Германскі ўрад у сваім адказе заявіў, што ён прыме меры для папярэджаньня падобных выпадкаў у будучым.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Сьпіс

дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для прапрацоўкі дакладаў аб 50-годзьдзі з дня сьмерці Карла Маркса ў вясковых парт'ячэйках 14—15 сакавіка 1933 г.

1-ы куст: сель.-гас. «Тарасава», Барысаўская, Рагачоская і імя Варашылава, адказны за скліканьне **Лабанаў**, дакладчык **Кучынскі** (БАН);

2-і куст: «Вішнёўка», «Бальшавік», «Камсамолец», Папярнянская, адказны за скліканьне т. т. **Саханько, Смарчкоў**, дакладчык **Пугачоў** (гістпарт);

3-і куст: с.-г. «1-е мая», «Курганы», адказны т. **Сомаў**, дакладчык **Кійко** (музэй рэвалюцыі);

4-ы куст: Асяпрышцкі гарадок, калгас «Новы шлях», адказны **Данілевіч**, дакладчык **Левіт** (ВКСГШ);

5-ы куст: «Русановічы», «Ленінскі шлях», Самахвалавічы, адказны **Бубянкоў**, дакладчык **Кулінковіч** (гістпарт);

6-ы куст: с.-г. «Калініна», Гатаўскае, адказны за скліканьне **Каранеўскі**, дакладчык **Каранеўскі** (гарсавет);

7-ы куст: с.-г. «Самузлева», Крупіцкае, адказны за скліканьне т. **Шчарбовіч**, дакладчык **Вольскі** (БАН);

8-ы куст: **Какайскае**, Міхановіцкае, адказны за скліканьне т. **Сьмірноў**, дакладчык **Андрэйчыкава** (ЦК КП(б)Б);

9-ы куст: **Калодзішчанскае**, Н.-Дворскае, адказны за скліканьне **Мацюхін**, дакладчык **Гярцовіч** (ВКСГШ);

10-ы куст: «Заціпіна», «Лошніца», адказны за скліканьне т. **Крыцкі**, дакладчык **Бандарэнка** (БАН);

11-ы куст: Караліцянскае, дакладчык **Віткоўскі** (БАН);

12-ы куст: Трасьцянецкае, II МТС, адказны за скліканьне **Каўшовіч**, дакладчык **Аляшкевіч** (БАН);

13-ы куст: «Абчат Горкі», Замастоцкае, адказны за скліканьне **Мунодчык**, дакладчык **Зяньковіч** (гарана);

14-ы куст: Строчацкая, с.г. «Строчыца», адказны за скліканьне **Карнейчык**, дакладчык **Мацюкевіч** (БАН);

15-ы куст: Грыгянскае, калгас імя Фалько, адказны за скліканьне т. **Патапаў**, дакладчык **Львовіч** (ВКСГШ);

16-ы куст: Сеніцкая ячэйка, с.-г. «Сеніца», ЗРК «Акцябр», адказны за скліканьне **Андрыеўскі**, дакладчык **Няхай** (ВКСГШ);

17-ы куст: с.-т. Дзяржынскага, калгас ДПУ «Прабудж. праца», адказны за скліканьне **Трушкевіч**, дакладчык **Шапіра** (ВКСГШ);

18-ы куст: с.-т. ЗРК «Бальшавік», ЗРК Варашылава, «Чырвоны транспарт.шік», адказны за скліканьне т. **Кудрачоў**, дакладчык **Віхнэс** (ВКСГШ);

19-ы куст: с.-т. Лекерта, «Чырвоны маяк», адказны за скліканьне **Герасімчык**, дакладчык **Кушняроў** (музэй рэвалюцыі);

20-ы куст: «Зялёны луг», «Новы сьвет», адказны за скліканьне **Котава**, дакладчык **Правільшчыкаў** (БДУ);

21-ы куст: 1-я МТС, «Санжаны», адказны за скліканьне **Мчынскі**, дакладчык **Папічанскі** (гарсавет).

Сакратаром сельячэек КП(б)Б забясьпечыць яўку на вызначаныя куставыя сходы ўсіх членаў і кандыдатаў КП(б)Б і камсамолу з прыцягненьнем шырокіх мас беспартыйнага калгаснага і саўгаснага актыву.

Адказным таварышом дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі аб часе і месцы правядзеньня сходаў і сродках перасоўкі.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Пастанова
пленуму Менскага Гарадзкога Савету ад 26 лютага 1933 году
Па дакладу мандатнай камісіі Гарсавету

1. Згадзіцца з пастановай мандатнай камісіі і наступных дэпутатаў са складу Савету XIII скліканьня выключыць, як скампрамэтаваўшых сябе і ня прымаўшых удзелу ў рабоце сэкцый:

1. Гольдвасэр Соню Майсееву (манд. № 110), выбрана ад утрымацэнцу будаўнікоў.

2. Шышкіна Мануіла Афанасьева (манд. № 309)—ад Прыгараднага сельсавету.

3. Мысьліўчыка Аркадзія Паўлава (манд. № 361), выбраны ад рабочых будаўнікоў.

4. Валёк Васіля Ільлікова (манд. № 76) — ад Самахвалаўскага сельсавету.

5. Ганчарову Ефрасінью Емельянаву (манд. № 96)—ад калектыву заводу імя Варашылава.

6. Кудзіновіча Міхася Георгіева (манд. № 274) — ад калектыву заводу «Чырвоны золак» і сьпіртзаводу.

7. Эпімаховіч Галену Фэліцыянаву (манд. № 311)—ад калектыву ВСНГВ, НКП, Гарсавету, ЦСПСВ.

УВАГА: Пералічаныя асобы павінны ў пяцідзённы тэрмін здаць арганізацыі, якая ім выдала мандаты.

2. Паставіць пытаньне перад выбаршчыкамі аб адкліканьні са складу Гарсавету наступных членаў і кандыдатаў Савету, якія ня прымаюць ніякага ўдзелу ў рабоце сэкцый і дэпутацкіх груп:

1. Гарнашэвіча Аляксандра Пятрова, выбран ад калектыву раб. ЦПП'у.
2. Жураўскую Марыю Лукʼянаву, выбрана ад утрымацэнцу будаўнікоў.
3. Жабровскую Сьцепаніду Францаўну—ад тубінстытуту і начной санаторыі.
4. Ваўковіча Міколу Іванава—ад А. Гарадзецкага сельсавету.
5. Вашкевіч Пелагею Ільлінаравну, ад арцелі «Пралетарыя».
6. Канапа Уладзімера Іванава—ад арцелей Сампрамсаюзу.
7. Курсьцік Галену Рэвоку Гіршаўну—адтрымацэнцу рабочых свайку гарбароў.
9. Плісана Рувіма Эльева—ад арцелей Сампрамсаюзу.
10. Навалрушкую Хану Мойсееву—ад 7 груп. дашкольных устаноў.
11. Лявонава Міколу Сьцяпанава—ад мясцкому № 8 саюзу Нархарч.

Даручыць аргмасавому аддзелу правесьці гета праз апульныя сходы выбаршчыкаў і замест пералічаных асоб выбраць новых членаў Савету.

3. Даручыць мандатнай камісіі ў дзекадны тэрмін праверыць работу членаў Гарсавету ўсіх сэкцый з мэтай адкліканьня тых членаў, якія ня прымаюць удзелу ў рабоце Гарсавету, сэкцый і дэпутацкіх груп.

Старшыня Менскага Гарсавету Валодзька.
Вык. аб. сакратара Менскага Гарсавету Ягоўдзін.

Пастанова
Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 9 сакавіка 1933 г.
Аб становішчы з вывазкай гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі

Адзначаючы, што становішча з вывазкай гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі знаходзіцца пад пагрозай зрыву, прэзыдыум Менскага гарадзкога савету **пастанаўляе:**

1. Скасаваць раней выданыя Злмельным Аддзелам нарады па вывазцы гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі, зацьвердзіць наступны парадак пры мацаваньня асобных установаў, арганізацый, вайсковых часьцей і інш. месц:

а) да саўгасу «Зялёны луг»: Клінічны гарадок, Дом Друку, друкарню Сталіна, сталовую-рэстаран, жакт № 26, ЗРК металістаў, завод «Камунар» і вай сковую часьць;

б) да саўгасу «Новы Сьвет»: ф-ку «Беларуска», друкарню «Зьвязда», Жакт № 27 і вайсковую часьць;

в) да саўгасу «Кастрычнік»: ф-ку «Кастрычнік», Салюхлеб, жакт № 68 і вайсковую часьць;

г) да саўгасу імя Варашылава: завод «Ударнік», завод імя Варашылава, Віленскі рынак, Самотаецкую, дом прыхільнікаў дзяцей, лямпавую фабрыку, завод «Чырвоны хэмік», Белгандаль, жакт № 60 і АБВШ;

д) да саўгасу «Бальшавік»: «Самотранс», завод «Бальшавік», транспарт асабовага гаражынсаюзу, арцель «Перамога», жакт № 59, млын «Адраджэньне» (Кальварыя), УМТ і вайсковыя часьці.

е) да саўгасу «Чырвоны маяк»: банка-пральны трэст, Белуціль, абутковую майстэрню гарсавету, аптэкафіраўніцтва, Загатзбожжа, бетонны завод, дэзінфекцыйную станцыю, абутковую фабрыку і сталоўку, ЗРК абутнікаў, ДОПР, Вагаканалпрэст, ФЗВ КІМ, арц ель абутнікаў, жакт № 29 і АБВШ (частку гною);

ж) да саўгасу «Чырвоны транспартнік»: транспарт МЦРК, сьпіртзавод, скурсындыкат, дом грунтовага дзяцей, арцель «Уперад», шпалерная фабрыка, сьвінаалкормачны пункт МЦРК, Сурапскі рынак, шчотачную фабрыку, базу Менпладагародпрэсту, гуту і вайсковую часьць.

з) да саўгасу «Санжаны»: ПЭЦ, ТСТ, бойню, алкормачны пункт № 2 (50 проц.), універсытэцкі гарадок, транспарт асабовага чыгункі, жакт № 53, Пастарафскі інстытут (Маскоўская вул.), малочны завод, фабрыку «Камунарка», асабов Камгасу і вайсковую часьць;

і) да саўгасу імя Лекерта: жакт № 39 і вайсковыя часьці;

к) да калёніі «Навінкі» (Гарадрада)—вайсковую часьць.

2. Абавязаць дырэктароў саўгасаў і загадчыкаў гаспадарак увесь гной з прымацаваных месц вывезьці да 15 сакавіка г. г. Невыканаваньне гэтага ў паказаны тэрмін будзе разглядацца, як сьвядомы зрыў мерапрыемстваў партыі і ўраду па павышэньні ўраджайнасьці.

3. Зацьвердзіць вытачу нарадаў прыватным асобам, малочным уласны транспарт і гной, і прымацаваньне іх да асобных саўгасаў і калгасаў для вывазкі гною. Прапанаваць прымацаваным (прыватным асобам) вывазку гною ў прымацаваныя гаспадаркі па выданых нарадах закончыць не пазьней 15 сакавіка г. г.

Абавязаць дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў і начальнікаў адпаведных аддзяленьняў міліцыі прасачыць за выкананьнем гэтага.

4. Абавязаць усе установы, арганізацыі і вайсковыя часьці, якія маюць свае гаспадаркі, вывазку гною закончыць не пазьней 15 сакавіка г. г.

5. Папярэдзіць кіраўнікоў установаў і арганізацый, а таксама дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў і прыватных асоб, прымацаваных для вывазкі гною ў прыгарадныя гаспадаркі, што ўсякая спроба з іх боку затрымаць вывазку ці дачу або вывазку гною да устаноўленага тэрміну—будзе расцэньвацца і разглядацца, як сьвядомая арганізацыя зрыву сяўбы, з прыцягненьнем вінаватых да суровай адказнасьці.

6. Даручыць тав. Люцыю і тав. Пэдару прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы, інфармуючы штодзенна прэзыдыум Гарсавету аб ходзе вывазкі.

Старшыня Менскага гарадзкога савету Валодзька.
В. А. сакратара Менгарсавету Ягоўдзін.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА (Каса ад 1 г. дня) — Новая вялікая савецкая камэдыя МЭКСЫКАНСКІЯ ДЫПЛЁМАТЫ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ (Каса—ад 12 г. дня) — Замежны мастацкі фільм ТРЫ ДЖЫГІ

ПРАЛЕТАРЫ (Каса—ад 12 г. дня) — Мастацкі фільм ЗЯМЛЯ У ПАЛОНЕ. Драма ў 6 част.

„СПАРТАК". (Каса—ад 1 г. дня) — Мастацкі фільм ЗАЛАТЫЯ РУКІ. драма ў 6 частках.

Паляшк. Яўр. Дзярж. Тэатар (вул. Валадарскага, 7, тэл. 21-813)

СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

МЮЗІК-ХОЛ

Лепшыя сатырыкі СССР НЯХЛЮДАВА І МУРАЎСКІ (музычальна-вакальны фэльетон).

3 —БАРАНЦОВЫ— 3 Ікарыйскія гульні.

3 —ДЫМІНІ— 3 (Паветраны палёт).

3 —РОНДА— 3 (Акробаты-эксцэнтрыкі).

БАЯРСКАЯ І АЛЕКСАНДРОЎ (балет), ЭДЗІ БАРТОН (аграцыён).

2 —ЛЕМЕШАВЫ— 2 (жаніглёры).

3 —НАЙСІ— 3 (вялёсыпэдысты).

ЛАЎРОВА-КІРПІЧОВА І САБІН (скэтч).

КУЗЬНЕЦОЎ І ЯБЛОНСКІ (дуэт).

БЫХАЎСКАЯ (сьпевы), СТРЫГІН (віртуоз-баяніст).

ШАНЬ І КАНРАД (балет).

ЧАРЛІ ЧАПЛІН (на проскэніуме).

Ля раялю ЦЫМЭРМАН.

Штодзенна 2 выступленьні, Пачатак 1-а у 8 г. увеч., 2-га—у 10 г. увеч. Па калектыўных заяўках скідка. Прымаюцца заяўкі на культпаходы.

ПРЫЁМ у Беларускі дзяржаўны тэхнікум фізкультуры

Працягнут да 25 сакавіка.

Прымаюцца студэнты (мужчыны і жанчыны) з адрывам і без адрыву ад вытворчасьці. Тэхнікум з 3-тадовым навучаньнем. На 1-шы курс прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодку, на 2-гі — якія працуюць ужо інструктарамі фізкультуры. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй і сталоўкай. Разьмер стыпэндыі выплачваецца па пасьпяховасьці.

Да заявы неабходна прымацаваць: матрыку аб нараджэньні, пасьведчаньне аб адукацыі, дведкі ат здароўі, аб сац. становішчы і рабочым стажы для рабочых, запоўніць анкету, якую павінен зацьвердзіць прафсаюз, а для сялян—сельсавет.

Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, вышэйшы савет фізкультуры, дырэктару тэхнікуму фізкультуры.

Дырэкцыя.

АНОНС! „Сіла мільёнаў раўстаньнем была, Але тых, хто ўмеў весьці, Барацьбой гартаваных, Гэтых было 28..." (Уладзімір Маякоўскі). 26 камісараў.

ПАСТАНОВА № 7 Прызыдыуму Менскага Гарадзкога Савету

9 сакавіка г. Менск.

У сувязі з неабходнасьцю вытварэньня неадкладнага рамонту турбагенэратара Менскай электрастанцыі прапануецца ніжэйпералічаным прадпрыемствам з 1 гадз. ночы да 7 гадз. вечара

12 сакавіка

ЗРАВІЦЬ ВЫХОДНЫ ДЗЕНЬ:

заводу імя Варашылава, заводу „Камунар", заводу „Ударнік", ф-цы „Кастрычнік", вяровачнай ф-цы, пастэрэўскаму інстытуту, друкарні імя Сталіна, 3-й арцелі інвалідаў і ўсім дробным прадпрыемствам, што знаходзяцца ў раёнах Нямігскай вул., плацу Волі і Гандлёвай вул.

Заводам—„Бальшавік" і імя Молатава падрыхтаваць 1-ы пусьціць свае рухавікі

Дырэкцыі МГЭС рамонт турбіны закончыць не пазьней 7 гадзін, 12 сакавіка г. г.

Старшыня Менгарсавету Валодзька
В. А. сакратара Гарсавету Ягоўдзін

АНОНС! „І ня сьцерці з твару румян, І ў зямлю ў сполаху не варыцца, Тому, кім здраджан Шэйлян, Тому, кім здраджан Джанрыдзі..." (Н. Асееў). 26 камісараў

ГАРАДЗКАЯ САНІТАРНАЯ СТАНЦЫЯ ЗАПРАШАЕ санітарных дактароў для працы ў гор. Менску і прыгарадным рабіце.

Першы ў БССР дзіцячы гукавы кіно-тэатр. Сёньня і штодзенна патрэсная праграма
1. Парад глісараў (гукавы фільм)
2. Тэмпы рашаюць (гукавы фільм)
3. Заўжды гатовы (нямы дз. фільм).
ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 11 г. раніцы. КАСА АДКРЫТА з 10 гадз. раніцы.
Прымаюцца заяўкі на матавыя сэансы са скідкай 20 проц.

Друкарня „ЗЬВЯЗДА" прымае вучняў індывідуальнага вучнёўства ў лінатыпны і стэратыпны цэхі.
Тэрмін навучаньня 6 месяцаў.
Заявы з дакумэнтамі аб сацпахдзжаньні і узросьце (не ніжэй 18 год) падаваць да 20 сакавіка.
Савецкая, 83, другі паверх.

БЕЛАРУСКАМУ АДДЗЯЛЕНЬНЮ „САЮЗДРУКУ" тэрмінова патрабуецца складзкое памяшканьне (ПАЖАДАНА Ў ЦЭНТРЫ ГОРАДУ)
З прапановамі зварачацца: Ленінская 34 (ва двары), або па тэл. 21-327, 14-86.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНЕЦЕ 7-81 АТС-21-358

СЬПІС
дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б
ДЛЯ ПРАПРАЦОЎКІ ДАКЛАДАЎ АБ 50-ЦІГОДЗЬДЗІ З ДНЯ СЬМЕРЦІ КАРЛА МАРКСА НА ПАРТЫЙНЫХ СХОДАХ 14—15 САКАВІКА.

Тав. Крывіцкі (БАН) — завод імя Варашылава; Краўчук (ВКСГШ) — завод «Камунар»; Каналлін (Саўбуд) — завод «Бальшавік»; Альтман (ВКСГШ) — завод імя Молатава; Агульнік (гістпарт) — фабрыка «Кастрычнік»; Руды (КІЖ) — завод «Ударнік»; Усьпенскі (БАН) — абутковая фабрыка; Лойка (ВКСГШ) — цклозавод; Пракапчук (БАН) — фабрыка «Камунарка»; Карнейчык (БАН) — хлебазавод; Данільчык (БАН) — шчотачная фабрыка; Брагінскі («Зьвязда») — друкарня імя Сталіна; Кукелка (БАН) —